# *Aneks do informatora maturalnego*

**od maja 2007 roku**

# JĘZYK BIAŁORUSKI

Warszawa 2006

Opracowano w Centralnej Komisji Egzaminacyjnej
we współpracy z okręgowymi komisjami egzaminacyjnymi

# IV. STRUKTURA I FORMA EGZAMINU

## 1. Opis egzaminu

Egzamin maturalny z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej jest egzaminem obowiązkowym dla uczniów uczących się tego języka w szkole. Składa się z dwóch części:

a) **ustnej**, dla której nie określa się poziomu, a która jest zdawana w szkole i oceniana przez przedmiotowy zespół egzaminacyjny,
b) **pisemnej** – zdawanej na poziomie podstawowym lub rozszerzonym, zdawanej w szkole i ocenianej przez egzaminatorów okręgowej komisji egzaminacyjnej.

**Ustna część egzaminu** składa się z dwóch części:

a) wypowiedzi zdającego (prezentacji) na wybrany temat,
b) rozmowy zdającego z egzaminatorami dotyczącej prezentacji i/lub bibliografii.

**Pisemna część egzaminu** może być zdawana na zadeklarowanym przez ucznia poziomie:

a) podstawowym, sprawdzającym rozumienie czytanego tekstu nieliterackiego oraz pisania tekstu własnego związanego z tekstem literackim zawartym w arkuszu egzaminacyjnym

lub

b) rozszerzonym, sprawdzającym rozumienie czytanego tekstu nieliterackiego oraz pisania tekstu własnego związanego z tekstem literackim zawartym w arkuszu egzaminacyjnym.

## 2. Szczegółowy opis ustnej części egzaminu

**Ustna część egzaminu** trwa około 25 minut i sprawdza przede wszystkim umiejętność komunikacji werbalnej oraz umiejętność organizowania warsztatu pracy.

**1) Przygotowanie do egzaminu:**

a) nauczyciele języka białoruskiego przedstawiają uczniowi na początku nauki w klasie maturalnej szkolną listę tematów,
b) z listy zaproponowanych tematów uczeń wybiera jeden i określa sposób jego realizacji oraz zakres materiału służącego do opracowania tematu,
c) liczba tematów przygotowanych w szkole powinna być taka, by zapewniała uczniom możliwość wyboru i samodzielność pracy; uczniowie mogą wybrać ten sam temat,
d) materiały pomocnicze, które uczeń może (o ile temat na to pozwala) wykorzystać podczas egzaminu to, np.: wykonany przez siebie film, nagrania muzyczne, nagranie wywiadu lub wypowiedzi w języku białoruskim, cytaty z literatury podmiotu i przedmiotu, reprodukcje dzieł sztuki, kadry z filmu, fotografie zabytków architektury,
e) podczas egzaminu zdający może korzystać z planu prezentacji, zgodnie z zamieszczonym w tej publikacji wzorem,
f) uczeń ma obowiązek dostarczyć dyrektorowi szkoły, najpóźniej 4 tygodnie przed egzaminem, bibliografię, czyli spis literatury podmiotu i przedmiotu wykorzystany przez zdającego do przygotowania prezentacji.
g) tydzień przed egzaminem dostarcza dyrektorowi szkoły ramowy plan prezentacji oraz informację o zaplanowanym materiale pomocniczym.

**Wzór planu prezentacji, z którego zdający może korzystać podczas egzaminu**
Plan nie może przekraczać 1 strony A4.

| |
|---|
| Imię i nazwisko<br><br>TEMAT<br>Ramowy plan prezentacji<br>1. Określenie problemu, przedstawienie tezy lub hipotezy<br>2. Kolejność prezentowanych argumentów (treści)<br>3. Wnioski<br>Wykaz materiałów pomocniczych<br>1. ............................<br>2. ............................<br>3. ............................ Podpis zdającego |

**2) Przebieg egzaminu:**

a) w części pierwszej, która trwa około 15 minut, sprawdzana jest umiejętność mówienia w języku białoruskim, wiedza w zakresie wyznaczonym przez temat i wykorzystanie przygotowanych materiałów pomocniczych,
b) w części drugiej – w której sprawdzane są: rozumienie pytań przez zdającego, umiejętność formułowania odpowiedzi, samodzielność przygotowania prezentacji, umiejętność obrony własnego stanowiska – przedmiotowy zespół egzaminacyjny podejmuje ze zdającym rozmowę w języku białoruskim dotyczącą tematu lub /i bibliografii. Przedmiotowy zespół egzaminacyjny może podjąć rozmowę dopiero po wysłuchaniu prezentacji. Jeśli zdający nie wygłosi prezentacji, zespół nie podejmuje ze zdającym rozmowy,
c) zadane pytania odnotowuje w protokole egzaminu,
d) na podstawie obu części egzaminu są sprawdzane i oceniane sprawność oraz poprawność językowa.

**3) Zasady oceniania ustnej części egzaminu**

Egzamin jest oceniany według kryteriów jednakowych w całym kraju.
W ustnej części egzaminu ocenie podlegają: prezentacja tematu (zawartość merytoryczna i kompozycja wypowiedzi), rozmowa o problemach, związanych z prezentowanym zagadnieniem oraz sprawność językowa, która jest oceniana na podstawie obu części egzaminu.

W sumie za ustną część egzaminu zdający może uzyskać 20 punktów w następującym układzie:

**Waga poszczególnych kategorii kryteriów oceniania**

| **Kategorie kryteriów** | **Waga wyrażona w procentach** | **Waga wyrażona w punktach (20 pkt)** |
|---|---|---|
| realizacja tematu i kompozycja | 25% | 5 pkt |
| Rozmowa | 30% | 6 pkt |
| Język | 45% | 9 pkt |

**Ustną część egzaminu ocenia szkolny zespół egzaminacyjny według kryteriów załączonych na następnej stronie**.

Zdający zdał egzamin ustny, jeżeli otrzymał co najmniej 30% punktów możliwych do uzyskania w tej części egzaminu.

<table>
<tr><th colspan="9">KRYTERIA OCENIANIA USTNEJ ODPOWIEDZI</th></tr>
<tr><th rowspan="2">POZIOMY</th><th colspan="4">PREZENTACJA</th><th rowspan="2">ROZMOWA</th><th rowspan="2">Pkt</th><th rowspan="2">JĘZYK</th><th rowspan="2">Pkt</th></tr>
<tr><th>Realizacja tematu</th><th>Pkt</th><th>Kompozycja wypowiedzi</th><th>Pkt</th></tr>
<tr><td>I<br>8pkt</td><td>1. na ogół trafnie dobiera materiał rzeczowy do tematu,<br>2. poprawnie interpretuje materiał rzeczowy (dopuszcza się możliwość odtwórczych interpretacji),<br>3. prezentuje podstawowe zagadnienia na ogół w związku z tematem,<br>4. podejmuje częściowo udaną argumentację (nie hierarchizuje argumentów),<br>5. formułuje na ogół poprawne wnioski,<br>6. wykorzystuje materiał pomocniczy (o ile temat tego wymaga).</td><td>1</td><td>1. buduje wypowiedź na ogół uporządkowaną i spójną (dopuszczalne zachwiania logicznego ciągu i/lub proporcji poszczególnych części wypowiedzi).</td><td>1</td><td>1. na ogół rozumie pytania i formułuje poprawne merytorycznie, choć dość ogólne odpowiedzi,<br>2. uczestnictwo w rozmowie ogranicza się do krótkich, (ale nie jednowyrazowych) ogólnikowych odpowiedzi na pytania.</td><td>2</td><td>1. posługuje się językiem zrozumiałym, lecz często niepoprawnym lub językiem charakterystycznym dla odmiany pisanej (wypowiedź wyuczona na pamięć,<br>2. używa mało urozmaiconych struktur składniowych, zasób słownictwa jest wystarczający dla zrozumienia wypowiedzi,<br>3. posługuje się stylem nie zawsze adekwatnym do sytuacji.</td><td>4</td></tr>
<tr><td>II<br>14pkt</td><td>1. trafnie dobiera materiał rzeczowy do tematu,<br>2. poprawnie interpretuje materiał rzeczowy, wykorzystując podstawowe konteksty,<br>3. prezentuje zagadnienia związane z tematem,<br>4. podejmuje logiczną argumentację (nie zawsze hierarchizuje argumenty),<br>5. formułuje wnioski i opinie,<br>6. funkcjonalnie wykorzystuje materiał pomocniczy (o ile temat tego wymaga).</td><td>2</td><td rowspan="2">1. buduje wypowiedź zorganizowaną (z wyraźnym punktem wyjścia, z uporządkowaną argumentacją i z logicznymi wnioskami; zachowuje właściwe proporcje między częściami wypowiedzi).</td><td rowspan="2">2</td><td>1. rozumie pytania i formułuje poprawne merytorycznie, choć zbyt zwięzłe odpowiedzi,<br>2. broni własnego stanowiska (rozumie stanowisko nadawcy), uczestniczy w rozmowie.</td><td>4</td><td>1. posługuje się na ogół poprawnie mówionym językiem ojczystym (uwzględniając zasady ortofonii),<br>2. używa dość urozmaiconych struktur składniowych i leksyki,<br>3. posługuje się stylem komunikatywnym, stosownym do sytuacji.<br>4. zauważa popełnione przez siebie błędy i je poprawia.</td><td>6</td></tr>
<tr><td>III<br>20 pkt</td><td>1. interesująco dobiera materiał rzeczowy do tematu,<br>2. wnikliwie interpretuje materiał rzeczowy, przywołując różnorodne konteksty,<br>3. prezentuje zagadnienia w ścisłym związku z tematem,<br>4. podejmuje logiczną, przemyślaną argumentację (hierarchizuje argumenty),<br>5. formułuje wnioski i opinie, wartościuje, uogólnia, syntetyzuje,<br>6. funkcjonalnie wykorzystuje materiał pomocniczy (o ile temat tego wymaga),<br>7. integruje wiedzę z różnych dziedzin humanistyki (o ile temat tego wymaga).</td><td>3</td><td>1. rozumie pytania i formułuje poprawne merytorycznie, wyczerpujące odpowiedzi, wykorzystując bibliografię i/lub materiały pomocnicze,<br>2. przekonywająco broni własnego stanowiska (rozumie stanowisko nadawcy), swobodnie uczestniczy w rozmowie.</td><td>6</td><td>1. posługuje się poprawnie mówionym językiem ojczystym (uwzględniając zasady ortofonii),<br>2. używa różnorodnych struktur składniowych, bogatej frazeologii i leksyki,<br>3. posługuje się stylem stosownym do sytuacji, przestrzega zasad etykiety językowej,<br>4. nadaje językowi swojej wypowiedzi cechy indywidualne.<br>5. zauważa popełnione przez siebie błędy i je poprawia.</td><td>9</td></tr>
</table>

Uwaga: punkty przyznaje się za cały opisany **na danym poziomie** element kryteriów (realizacja tematu, kompozycja, rozmowa, język), nie przyznaje się punktów cząstkowych. Wypowiedź zdającego może być więc oceniona np. tak: za realizację tematu – 3 pkt (p. III), za kompozycję wypowiedzi – 1 pkt (p. I), za rozmowę – 4 pkt (p. II), za język – 6 pkt (p. III), razem 14 pkt na 20 możliwych do uzyskania.

## 3. Szczegółowy opis pisemnej części egzaminu

### Poziom podstawowy

Pisemna część egzaminu na poziomie podstawowym sprawdza umiejętność czytania ze zrozumieniem tekstu nieliterackiego oraz umiejętność pisania tekstu własnego związanego z tekstem literackim zawartym w arkuszu egzaminacyjnym. Tekst literacki, do którego został sformułowany temat, pochodzi z listy lektur zamieszczonej w *Informatorze maturalnym / język białoruski / od 2005*. Nowa lista lektur zamieszczona w tym aneksie będzie obowiązywała na egzaminie maturalnym, który odbędzie się w maju 2009 roku.

Czas na rozwiązanie zadań z arkusza I. wynosi 170 minut.

**Waga poszczególnych części egzaminu**

| Sprawdzane umiejętności | Waga wyrażona w procentach | Waga wyrażona w punktach |
|---|---|---|
| **Rozumienie czytanego tekstu** | **30%** | **21 pkt** |
| **Pisanie tekstu własnego** | **70%** | **49 pkt** |

Arkusz na poziomie podstawowym składa się z dwóch integralnych części:

1) **W części pierwszej arkusza zamieszczone zostanie zadanie sprawdzające rozumienie czytanego tekstu.** Maturzysta otrzymuje arkusz egzaminacyjny, zawierający tekst (do 1000 słów) i test (12-16 pytań otwartych i / lub zamkniętych).

**Tekst służący do sprawdzania umiejętności rozumienia czytanego tekstu będzie:**

a) publicystyczny lub popularnonaukowy,
b) przejrzyście skonstruowany,
c) napisany starannym językiem białoruskim,
d) nieobrażający uczuć i światopoglądu zdającego oraz przedstawicieli innych narodowości,
e) współczesny.

**Pytania testu sprawdzającego rozumienie czytanego tekstu mogą dotyczyć:**

a) poziomu znaczeń, czyli:
   - rozumienia słów, związków frazeologicznych, zdań; odczytywania znaczeń dosłownych i metaforycznych, znaczeń słów z kontekstu, odróżniania informacji od opinii, znajdowania słów – kluczy,
   - rozumienia myśli zawartej w akapicie lub części tekstu, wyszukiwania informacji, selekcjonowania informacji, hierarchizowania, porównywania, dostrzegania analogii i przeciwieństw,
   - rozumienia głównej myśli tekstu – rozumienia tekstu jako całości oraz umiejętności wnioskowania;

b) poziomu struktury, czyli:
   - kompozycji tekstu, tj. odróżniania wstępu, rozwinięcia, zakończenia, wskazywania zasady kompozycyjnej,
   - odkrywania związków logicznych, czyli rozumienia toku przyczynowo-skutkowego, wskazywania, np. tezy, hipotezy, argumentów, kontrargumentów, przykładów, wniosków, zależności między zdaniami, akapitami i częściami tekstu,
   - rozumienia znaczenia występujących w tekście wyrazów wskazujących na tok myślenia autora, czyli rozumienia sensu słów sygnalizujących wnioskowanie, podtrzymywanie myśli, zwrot myśli, dygresję, powtórzenie myśli oraz słów nawiązujących do myśli zawartej w poprzednim akapicie;

c) poziomu komunikacji, czyli:
   - genezy tekstu,
   - rozpoznawania nadawcy,
   - dostrzegania celu tekstu (intencji nadawcy),
   - adresata i sposobu oddziaływania na niego,
   - dostrzegania cech stylistycznych tekstu i rozumienia funkcjonalności środków językowych.

2) **W części drugiej arkusza zamieszczone zostały zadania sprawdzające umiejętność pisania własnego tekstu** o literaturze (kulturze, języku). Maturzysta otrzymuje 2 tematy. Punktem wyjścia pracy abiturienta jest tekst / teksty (do 1000 słów), do których zostały sformułowane tematy. Maturzysta otrzymuje arkusz egzaminacyjny zawierający 2 tematy do wyboru. Wybiera jeden z nich i pisze wypracowanie w miejscu do tego wyznaczonym.

Utwory literackie będące podstawą zadania maturalnego pochodzą z listy zamieszczonej w *Informatorze maturalnym/ język białoruski / od 2005 roku* w rozdziale *„Wymagania egzaminacyjne – poziom podstawowy"*.

Tematy na poziomie podstawowym sprawdzają umiejętności:
skomponowania dłuższej, spójnej wypowiedzi w języku białoruskim,
odczytania utworu /utworów przede wszystkim na poziomie idei**.** Tematy mogą dotyczyć:
**interpretowania**
- problemu zawartego w tekście / tekstach,
- fragmentu tekstu w odniesieniu do całości utworu,
- problemu zawartego w tekście w odniesieniu do innego tekstu niezamieszczonego w arkuszu egzaminacyjnym, ale pochodzącego z listy lektur dla poziomu podstawowego,

**charakteryzowania**
- bohatera,
- sposobu kreowania bohatera,
- świata przedstawionego utworu,

**określania** funkcji motywów, toposów, symboli wymienionych w podstawie programowej dla poziomu podstawowego.

Tekst lub teksty oraz sposób sformułowania tematu wskazują, które z wymienionych wyżej umiejętności są sprawdzane w danym arkuszu egzaminacyjnym.
Umiejętności sprawdzane na poziomie podstawowym zależą od sposobu sformułowania tematu i od rodzaju tekstu / tekstów, do których temat jest sformułowany.

**Poziom rozszerzony**

Pisemna część egzaminu na poziomie rozszerzonym sprawdza umiejętność czytania ze zrozumieniem tekstu nieliterackiego (innego niż na poziomie podstawowym) oraz umiejętność pisania tekstu własnego związanego z tekstem literackim zawartym w arkuszu egzaminacyjnym. Tekst literacki, do którego został sformułowany temat, pochodzi z listy lektur zamieszczonej w *Informatorze maturalnym / język białoruski / od 2005 roku*. **Nowa lista lektur, która została zamieszczona w tym aneksie, będzie obowiązywała na egzaminie maturalnym, który odbędzie się w maju 2009 roku.**

Czas na rozwiązanie zadań z arkusza I. wynosi 180 minut.

Uczniowie, którzy przystępują do egzaminu na poziomie rozszerzonym, nie rozwiązują zadań z arkusza przeznaczonego dla poziomu podstawowego, jednakże muszą pamiętać, że wymagania egzaminacyjne dla poziomu rozszerzonego zawierają wymagania z poziomu podstawowego.

## Waga poszczególnych części egzaminu na poziomie rozszerzonym

| | Sprawdzane umiejętności | Waga wyrażona w procentach | Waga wyrażona w punktach |
|---|---|---|---|
| **Poziom rozszerzony** | **Rozumienie czytanego tekstu** | **25%** | **15 pkt** |
| | **Pisanie tekstu własnego** | **75%** | **45 pkt** |

Egzamin na poziomie rozszerzonym różni się od egzaminu na poziomie podstawowym zakresem sprawdzanych umiejętności oraz kryteriami oceniania.

Arkusz na poziomie rozszerzonym składa się z dwóch części:

1) **W części pierwszej arkusza zamieszczone zostało zadanie sprawdzające rozumienie czytanego tekstu.** Maturzysta otrzymuje arkusz egzaminacyjny, zawierający tekst (do 1000 słów) i test (10 - 15 pytań otwartych i / lub zamkniętych).

Opis tekstu i zadań testowych jest taki sam jak na poziomie podstawowym.

2) **W części drugiej arkusza zamieszczone zostały zadania sprawdzające umiejętność pisania własnego tekstu** o literaturze (kulturze, języku). Maturzysta otrzymuje 2 tematy. Wybiera jeden temat i pisze wypracowanie w miejscu wyznaczonym w arkuszu egzaminacyjnym.

Punktem wyjścia pracy abiturienta jest tekst / teksty lub ich fragmenty (do 1000 słów). Utwory literackie, będące podstawą zadania maturalnego, pochodzą z listy zamieszczonej w *Informatorze maturalnym*, w rozdziale *„Wymagania egzaminacyjne – poziom rozszerzony”*. Teksty mogą pochodzić również z wykazu lektur przeznaczonych dla poziomu podstawowego, ale tylko w zestawieniu z tekstem przeznaczonym dla poziomu rozszerzonego. **Jeden z tekstów może pochodzić spoza listy zamieszczonej w informatorze,** np. tekst literacki, krytycznoliteracki, popularnonaukowy.

Tematy na poziomie rozszerzonym sprawdzają umiejętności:

1) skomponowania dłuższej, spójnej wypowiedzi w języku białoruskim,
2) odczytania utworu na poziomie idei i **organizacji artystycznej**. Realizacja tematów na poziomie rozszerzonym wymaga zanalizowania i zinterpretowania tekstów. Tematy mogą dotyczyć:
   - porównywania tekstów,
   - charakteryzowania sposobu kreowania bohatera,
   - charakteryzowania sposobu kreowania świata przedstawionego utworu,
   - określania funkcji motywów, toposów, symboli, wymienionych w podstawie programowej dla poziomu rozszerzonego,
   - analizowania języka utworu / utworów,
   - odwoływania się do kontekstów, np. prądu, epoki, innego utworu wymienionego w *Informatorze* (w liście lektur dla poziomu podstawowego lub/i rozszerzonego), kontekstu historycznego, biograficznego, filozoficznego.

Tekst lub teksty oraz sposób sformułowania tematu wskazują, które z wymienionych wyżej umiejętności są sprawdzane w danym arkuszu egzaminacyjnym.
Umiejętności sprawdzane na poziomie rozszerzonym zależą od sposobu sformułowania tematu i od rodzaju tekstu / tekstów, do których temat jest sformułowany.

W trakcie pisania egzaminu zdający mogą korzystać ze słowników językowych.

## 4. Zasady oceniania pisemnej części egzaminu

### Poziom podstawowy

Egzamin pisemny w każdej części oceniany jest według kryteriów oceniania opracowanych dla poszczególnych zadań.

W pierwszej części **egzaminu pisemnego na poziomie podstawowym** – za test sprawdzający rozumienie czytanego tekstu – zdający może otrzymać maksymalnie **21 punktów**. Przy zadaniach testowych umieszczona zostanie informacja o maksymalnej liczbie punktów, a uszczegółowione normy zaliczenia zostaną opisane w modelu odpowiedzi.

W drugiej części egzaminu na poziomie podstawowym w ocenie zadania sprawdzającego umiejętność pisania własnego tekstu zdający może otrzymać maksymalnie **49 punktów**. Łącznie za rozwiązanie zadań z arkusza I – **70 punktów.** Za podstawowe kryteria uznaje się poprawność językową i rozwinięcie tematu, za kryterium wspomagające – kompozycję.

**Waga poszczególnych kategorii kryteriów oceniania umiejętności pisania tekstu własnego na poziomie podstawowym**

| Kategorie kryteriów | Waga wyrażona w procentach | Waga wyrażona w punktach (49 pkt) |
|---|---|---|
| Rozwinięcie tematu | 45% | 22 pkt |
| kompozycja | 8% | 4 pkt |
| język | 47% | 23 pkt |

Z 22 punktów przeznaczonych na ocenę rozwinięcia tematu zdający może otrzymać 18 za treści merytoryczne oraz 4 za sformułowanie pełnego wniosku.

**Kryteria oceniania języka i kompozycji na poziomie podstawowym**

| Język i kompozycja | | 27 pkt |
|---|---|---|
| **2. Składnia i fleksja** | **Poprawna i nieschematyczna składnia i poprawna fleksja** | **9** |
| | Poprawna składnia i fleksja | 7 |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja | 5 |
| | Mimo błędów, składnia i fleksja niezakłócająca komunikatywności języka | 3 |
| **3. Słownictwo, frazeologia, styl** | **Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl** | **10** |
| | Na ogół wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, komunikatywny styl | 7 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | 4 |
| **4. Ortografia, interpunkcja** | **Na ogół bezbłędna ortografia i interpunkcja** | **4** |
| | Nieliczne błędy ortograficzne różnego stopnia i błędy interpunkcyjne również drugiego stopnia | 3 |
| | Błędy ortograficzne z przewagą drugorzędnych i liczne interpunkcyjne z przewagą drugorzędnych | 1 |
| **5. Kompozycja** | **Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna** | **4** |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części | 3 |
| | Wskazująca na próby porządkowania myśli, na ogół spójna | 1 |

**Poziom rozszerzony**

**Za egzamin na poziomie rozszerzonym** zdający może otrzymać maksymalnie **60 punktów** – za rozwiązanie testu sprawdzającego rozumienie czytanego tekstu – **15 punktów,** za napisanie wypracowania – **45 punktów**.

**Waga poszczególnych kategorii kryteriów oceniania umiejętności pisania tekstu własnego na poziomie rozszerzonym**

| Kategorie kryteriów | Waga wyrażona w procentach | Waga wyrażona w punktach (45 pkt) |
|---|---|---|
| Rozwinięcie tematu | 63% | 25 pkt |
| kompozycja | 5% | 2 pkt |
| język | 32% | 18 pkt |

Z 25 punktów przeznaczonych na ocenę rozwinięcia tematu zdający może otrzymać 4 za sformułowanie pełnego wniosku.

**Kryteria oceniania języka i kompozycji na poziomie rozszerzonym**

| | **Język i kompozycja** | **20 pkt.** |
|---|---|---|
| **2. Składnia i fleksja** | **Poprawna i nieschematyczna składnia oraz poprawna fleksja** | **6** |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja | 4 |
| | Mimo błędów składnia i fleksja niezakłócająca komunikatywności języka | 2 |
| **3. Słownictwo, frazeologia, styl** | **Bogate i zróżnicowane słownictwo oraz poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl** | **8** |
| | Wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, komunikatywny styl | 5 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | 2 |
| **4. Ortografia, interpunkcja** | **Bezbłędna ortografia, poprawna interpunkcja** | **3** |
| | Na ogół bezbłędna ortografia, na ogół poprawna interpunkcja | 2 |
| | Błędy ortograficzne i interpunkcyjne z przewagą drugorzędnych | 1 |
| **5. Kompozycja** | **Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna** | **3** |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części | 1 |

**Wyniki egzaminu maturalnego w części pisemnej**

Zdający zdał egzamin maturalny w części pisemnej z języka białoruskiego, jeżeli na poziomie podstawowym lub rozszerzonym otrzymał co najmniej 30% punktów możliwych do uzyskania za rozwiązanie zadań na wybranym przez siebie poziomie.

# V. WYMAGANIA EGZAMINACYJNE

Tematy wypracowań na egzamin pisemny będą formułowane na podstawie *Standardów wymagań egzaminacyjnych* zamieszczonych w *Informatorze maturalnym / od 2005 roku / Język białoruski* oraz w związku z podaną niżej listą lektur, która **obowiązuje od maja 2009 roku**. Do maja 2008 roku (łącznie z egzaminem dojrzałości, który odbędzie się w maju 2008 roku) obowiązuje lista lektur zamieszczona w *Informatorze maturalnym / od 2005 roku / Język białoruski.*

**Poziom podstawowy**

1. Аповесць пра Грунвальдскую бітву (з Хронікі Быхаўца)
2. Францыск Скарына – Прадмова да ўсёй Бібліі
3. Песні - Купалінка, калядкі (адна на словы Віктара Шведа)
4. Паданні і легенды - Рагнеда і Уладзімір
5. Кастусь Каліноўскі – Пісьмы з-пад шыбеніцы
6. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – Пінская шляхта
7. Францішак Багушэвіч- Прадмова да "Дудкі беларускай", Хмаркі
8. Максім Багдановіч – Пагоня, Зорка Венера, Слуцкія ткачыхі, Санет, Па- над белым пухам вішняў
9. Янка Купала – Спадчына, Не шукай, І прыйдзе, Курган

10 Якуб Колас – Адзінокае дрэва, Новая зямля (раздзелы: Леснікова пасада, Воўк, Каляды, Вялікдзень, Смерць Міхала), У палескай глушы (скарочана - з падручніка да II класа)
11. Кузьма Чорны- Макаркавых Волька
12.Максім Танк – Рукі маці, Ave Maria, Шчасце,***О,як лёгка ісці, ***І радасць - ніякая радасць, а горыч
13.Васіль Быкаў – Калі хочацца жыць, Аблава (скарочана - з "Хрэстаматыі да сярэдніх школ)
14.Уладзімір Караткевіч – Зямля пад белымі крыламі (фрагменты з "Хрэстаматыі для сярэдніх школ), Багдановічу, На Беларусі Бог жыве
15.Іван Мележ – Людзі на балоце (частка I, раздзел V)
16.Барыс Сачанка – Дарога праз лес, Вярніся, вярніся
17.Рыгор Барадулін – Трэба дома бываць часцей
18.Сяргей Грахоўскі – Першае каханне
19.Алесь Разанаў – Снег, Дзічка
20.Наталля Арсеннева – Малітва, Восень, Шчасце, Між берагамі
21.Ларыса Геніюш- Князь Усяслаў Чарадзей, Бацькаўшчына, Споведзь (частка І- Жлобаўцы)
22. Масей Сяднёў- Айчына
23.Ян Чыквін – А дом наш недзе, Партрэт з памяці (з "Хрэстаматыі для сярэдніх школ)
24.Алесь Барскі – Твой твар, Я сын зямлі беластоцкай
25.Сакрат Яновіч – Гасцінец, Элегія пакінутага гнязда
26.Віктар Швед – Лёс чалавечы, Прамінанне
27.Мікалай Гайдук – Мера чалавечнасці

**Poziom rozszerzony**

1. Статут Вялікага княства Літоўскага – раздзелы: Сямейнае права, Спадчынае права, Ахова прыроды
2. Мікола Гусоўскі –Песня пра зубра (урывак з падручніка да I класа)
3. Цётка – Мора
4. Максім Багдановіч – Апокрыф, ***Я хацеў-бы спаткацца з Вамі на вуліцы, Хто мы такія?
5. Янка Купала – Незалежнасць, Прарок, Тутэйшыя, Больш самачыннасці

6. Якуб Колас – Новая зямля
7. Максім Гарэцкі – Фантазія
8. Францішак Грышкевіч – Малітва
9. Уладыслаў Казлоўшчык – Ня ў нас вясна
10.Ларыса Геніюш – ***Крывёй напоўніліся поймы рэк
11.Масей Сяднёў – Малітва, Яе няма
12.Васіль Быкаў – Два маэстры, На чорных лядах, Сцяна (скарочана- з падручніка да III класа)
13.Уладзімір Арлоў – Незалежнасць, Час чумы
14.Уладзімір Караткевіч – Жанчыне з бэзам, Быў.Ёсць.Буду, Дзікае паляванне караля Стаха (урывак з падручніка да III класа)
15.Аляксей Дудараў –Вечар
16.Алесь Разанаў –Дуб, Спадчына
17.Надзея Артымовіч – ***ікона, ***паэты паміраюць тады
18.Сакрат Яновіч – Дзённікі(1987-1993)

# VII. PRZYKŁADOWE ARKUSZE I SCHEMATY OCENIANIA






**Miejsce na naklejkę z kodem szkoły**

*dysleksja*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

### Czas pracy 170 minut

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 14 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Rozwiązania zadań zamieść w miejscu na to przeznaczonym.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora, a błędne zapisy przekreśl.
5. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
6. Możesz korzystać ze słowników językowych.
7. Wypełnij tę część karty odpowiedzi, którą koduje zdający. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
8. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Zamaluj ■ pola odpowiadające cyfrom numeru PESEL. Błędne zaznaczenie otocz kółkiem ⊙ i zaznacz właściwe.

**Życzymy powodzenia!**

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **70 punktów**

*21 za część 1*
*49 za część 2*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

**PESEL ZDAJĄCEGO**

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**KOD ZDAJĄCEGO**

**Część I – rozumienie tekstu**

**Прачытай уважліва тэкст Міхаіла Кацара і адкажы на пытанні. Пішы коратка, згодна з патрабаваннямі.**

Міхаіл Кацар

***Вобразы жыцця***
(скарочана)

1. Кожны від мастацтва вызначаецца ўласцівымі толькі яму мастацкімі сродкамі, спосабамі адлюстравання рэчаіснасці, асаблівасцямі ўвасаблення[1] рэальных ці ўяўных вобразаў.
2. Архітэктура аперыруе прасторавымі, аб'ёмнымі, манументальнымі катэгорыямі. Яна адлюстроўвае разуменне чалавекам свайго месца ў прасторы, светабудове, сусвеце.
3. Жывапіс нараджае пачуцці далучэння да шматфарбнасці свету, абуджае тонкія душэўныя перажыванні, звязаныя з паліхромнасцю[2] нашага асяроддзя і жыцця.
4. Графіка адольвае перадаваць і раскрываць вытанчаныя вобразы і пачуцці больш абмежаванымі сродкамі: супрацьпастаўленнем святла і цемры, белага і чорнага, яркага і цьмянага.
5. Скульптура карыстаецца сродкамі пластыкі. Яна адлюстроўвае пачуцці, якія ўзнікаюць ад успрыняцця аб'ёмных пластычных форм, цвёрдасці і мяккасці, гладкасці ці шурпатасці фактуры.
6. А вось у арнаменце тканых і вышываных вырабаў, без перабольшання, увасобленыя[3] практычна ўсе асноўныя якасці названых відаў мастацтва. Кампазіцыя, малюнак, колер, кантраст, фактура, рытміка, стылізацыя ствараюць абагульненыя мастацкія вобразы, здольныя тым не менш выяўляць самыя складаныя пачуцці, увасабляць разнастайныя праявы жыцця, узаемаадносіны чалавека, прыроды, сусвету.
7. За многія стагоддзі традыцыйная арнаментыка ўвабрала жыццёвую мудрасць народа, яго надзеі і мары, гора і радасць. Яе кампазіцыя стрыманая і высакародная[4] тым не менш такая на першы погляд выяўленчая скупаватасць здольная раскрываць самыя складаныя пачуцці, увасабляць любыя жыццёвыя праявы ва ўсёй іх складанасці і шматграннасці.
8. Кожны ўзор нясе ў сабе той ці іншы сэнс, выяўляе пэўную ідэю. Адны ўзоры сімвалізуюць памяць аб продках, другія выказваюць зварот да багоў-заступнікаў, трэція ўвасабляюць прыродныя з'явы, чацвёртыя адлюстроўваюць пачуцці і надзеі чалавека. І ўсё гэта перадаецца мінімумам выяўленчых сродкаў згодна з вышэйшымі законамі прыгажосці. Як бачым, у народнай арнаментыцы класічна ўвасоблена адзінства формы і зместу.
9. Трэба зазначыць, што гэта падсвядома адчуваюць і самі майстрыхі. Яны нават крыўдзяцца, калі іх творы ацэньваеш толькі з пазіцыі прыгажосці, і звычайна цярпліва і настойліва пачынаюць тлумачыць змест, закладзены ў той ці іншы выраб. Для іх тканыя і вышываныя рэчы – як малітва, варажба, гаданне, слова ці нейкае дзеянне. Арнамент на вырабе – як свечка, ахвяра ў храм ці зварот да багоў. Пры гэтым майстрыхі не абцяжарваюць сябе залішняй дыферэнцыяцыяй[5], звяртаючыся і да язычніцкіх, і да хрысціянскіх багоў як да сваіх непасрэдных заступнікаў і абаронцаў.
10. Мы ўжо не раз пераконваліся, які глыбокі сэнс закладзены ў быццам бы простыя ўзоры, якія можна чытаць, як кнігу, глядзець, як спектакль ці кіно. Але, вядома, трэба дасканала ведаць жыццё народа, яго звычаі, традыцыі, характар. Толькі тады адкрыюцца ўсе

[1] **увасабленне –** wyrażenie
[2] **паліхромнасць** – wielobarwność
[3] **увасоблены** – przedstawiony
[4] **высакародны** – szlachetny
[5] **дыферэнцыяцыя** – dyferencjacja, różnicowanie się, wyodrębnienie

сакрэты, зашыфраваныя ў арнаментыцы мастацкіх вырабаў.[...]

11. На сваіх вырабах майстрыхі не толькі адлюстроўвалі сваё жыццё, свае надзеі. Нярэдка гэта былі і своеасаблівыя маўклівыя просьбы-звароты да багоў, ахвяра з мэтаю іх задобрыць. [...] Звычайныя майстрыхі-сялянкі сімваламі маглі адлюстраваць ці выказаць усё, што іх хвалявала: любоў да сям'і і дзяцей, да радзімы і яе прыроды, да працы і творчасці. Складаныя законы прыроды яны раскрывалі проста і зразумела: ромбы з адросткамі – сімвал Зямлі і Сонца, устаўленыя адзін у адзін – пачатак вясны, наступленне цяпла. Яны стварылі ўласную астралогію, свой гараскоп, якім карысталіся для вызначэння лёсу, будучыні.
12. Цікава, што сярод шматлікіх узораў народнай мастацкай творчасці мне не трапілася ніводнага з адлюстраваннем злых сіл, нячысціка, д'ябла, чарцей. Аказваецца, гэта старажытная народная традыцыя, якую дасканала раскрыла старая настаўніца [...] «Мы вышываем сонца, Каляду, Купалу таму, што яны прыносяць шчасце, дабро, каб была любоў, міласэрнасць. Усё, што кепска, што ад зла, ад нянавісці, ад нячысціка ды чарцей, у нашы ручнікі, мы не пускаем. Д'ябал, чорт, ведзьма – гэта зло, звада, варожасць. Мы вышываем толькі добрае, карыснае для чалавека.»
13. [...] Тканыя ды вышываныя вырабы – гэта і прыгажосць, і зварот да багоў. А навошта з дрэнным лезці да багоў? Толькі з дабром, любоўю, з адвечнымі клопатамі.
    У чым шчасце селяніна-хлебароба?
    Каб была свая зямелька ды каб яна добра радзіла.
    Каб была добрая сям'я, дружная, моцная, працавітая.
    Каб раслі здаровыя, паслухмяныя дзеці.
    Каб вадзіўся дастатак у хаце, каб на свята была і чарка, і скварка.

    З гэтым і звярталіся да сваіх багоў-заступнікаў, але і самі шчыра, аддана працавалі. Праца заўсёды была асноваю жыцця селяніна. А плён гэтай працы быў асноваю для мастацкай традыцыі.
14. На жаль, правадыры пралетарыяту палічылі гэтыя адвечныя рысы чалавека-працаўніка кансерватыўнымі і паспрабавалі сілаю загнаць яго ў прывідную «светлую будучыню». Так быў знішчаны сапраўдны селянін-гаспадар. Так яго адвучылі і ад мастацкай традыцыі.
15. Але на шчасце, захаваліся шматлікія ўзоры гэтай традыцыі, і сёння яны для нас – невычэрпная крыніца народнай мудрасці і жыццёвага вопыту нашых продкаў. За стагоддзі развіцця традыцыйная арнаментыка сканцэнтравала багаты вопыт назірання людзей за прыродаю, жыццём, рознымі зразумелымі і незразумелымі для іх з'явамі.

М. С. Кацар, *Вобразы жыцця.* [у:] Гэты ж, *Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка*, Мінск 1996, с. 204, 207.

# Заданні да тэксту

**Заданне 1** ***(1 пункт)***
Выберы адзін з дадзеных ніжэй пунктаў.

Прыведзены вышэй тэкст прысвечаны
а) Умовам жыцця беларускіх сялян.
б) Дасягненням розных відаў беларускага мастацтва: архітэктуры, скульптуры, жывапісу і графікі.
в) Адлюстраванню людскіх пажаданняў, вераванняў і мар у арнаментах тканых і вышываных вырабаў народных майстрых.

**Заданне 2** ***(1 пункт)***
На аснове аналізу вышэйдадзенага тэксту выясні метафарычнае значэнне загалоўка – «Вобразы жыцця».
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................

**Заданне 3** ***(1 пункт)***
Фармулюючы абагульненае выказванне пра адметнасць розных відаў мастацтва, М. Кацар ужыў у 3-ім абзацы акрэслення «жывапіс [...] абуджае тонкія душэўныя перажыванні». Звярні ўвагу на значэнне прыметніка *тонкі(я.)* Замяні яго іншым словам, але тоесным або блізкім па значэнню.
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................

**Заданне 4** ***(2 пункты)***
На аснове 2-га, 3-га, 4-га і 5-га абзацаў: у першым радку – назаві віды мастацтва, якія аперыруюць прасторавымі, аб'ёмнымі катэгорыямі, а ў другім – запішы назвы відаў, якія карыстаюцца малюнкам, колерам, святлом.
1............................................................................................................................................
2............................................................................................................................................

**Заданне 5** ***(2 пункты)***
Вызнач, у чым заключаецца адметнасць арнаментыкі тканых і вышываных вырабаў, пра якія гаворыць аўтар у 6-ым і 7-ым абзацах. Адказ запішы ў 2-3-х сказах.
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................

**Заданне 6** ***(2 пункты)***
На аснове 7-га і 8-га абзацаў выясні ў 2-х сказах: чаму народныя майстрыхі «крыўдзяцца, калі іх творы ацэньваеш толькі з пазіцыі прыгажосці».
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................
..............................................................................................................................................

**Заданне 7** ***(2 пункты)***
У 8-ым абзацы М. Кацар ужыў акрэсленне: «Арнамент на вырабе – як свечка, ахвяра ў храм ці зварот да багоў.» Напішы, пры дапамозе якіх моўных сродкаў стварыў ён гэтае вобразнае выказванне. Якую функцыю спаўняюць выкарыстаныя аўтарам моўныя сродкі ў гэтым сцвярджэнні?
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................

**Заданне 8** ***(2 пункты)***
Знайдзі 4 складаныя словы, якія пішуцца праз злучок. Абазнач, з якіх часціну мовы яны складзены. Карыстайся 7-ым, 10-ым, 12-ым абзацамі. Якую ролю поўніць другое слова, ў знойдзеных табой, складаных словах?
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................

**Заданне 9** ***(2 пункты)***
Карыстаючыся 9-ым і 10-ым абзацамі выясні, чаму арнаменты на вырабах сялянскіх майстрых назваў аўтар «своеасаблівымі маўклівымі просьбамі-малітвамі».
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................

**Заданне 10** ***(2 пункты)***
У 11-ым абзацы аўтар гаворыць, што сярод шматлікіх узораў народнай мастацкай творчасці не трапілася яму «ніводнага з адлюстраваннем злых сіл». На аснове 11-га і 12-га абзацаў напішы: як народ разумее функцыянальнае значэнне арнаменту?
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................

**Заданне 11** ***(1 пункт)***
У 13-ым абзацы гаворыцца пра заняпад мастацкіх традыцый беларускай арнаментыкі. Што, на думку аўтара, прычынілася да гэтага?
а) Развіццё прамысловасці і ўрбанізацыя.
б) Разрыў з народнымі мастацкімі традыцыямі.
в) Адсутнасць таленавітай моладзі.

**Заданне 12** ***(2 пункты)***
Абазнач жанравую катэгорыю вышэйдадзенага тэксту М. Кацара.
а) Апавяданне.
б) Нарыс.
в) Навукавы тэкст.
Выбар свой падмацуй двума аргументамі.
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................
..........................................................................................................................................

**Заданне 13** *(1 пункт)*
На падставе аналізу тэксту вызнач яго галоўную функцыю.
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................

**Część II – pisanie własnego tekstu**

**Arkusz zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność pisania własnego tekstu związanego z tekstem literackim dołączonym do tematu. Wybierz jeden z tematów i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl.**

**Тэма 1:**

**Параўнай вобразы Радзімы, прадстаўленыя ў творах Уладзіміра Караткевіча. На аснове верша *На Беларусі Бог жыве* і фрагментаў нарыса *Зямля пад белымі крыламі* напішы, у чым праяўляецца любоў пісьменніка да Радзімы.**

Уладзімір Караткевіч

***На Беларусі Бог жыве***

«На Беларусі Бог жыве» –
Так кажа мой просты народ.
Тую праўду сцвярджае раса ў траве
І адвечны зор карагод.
Тую праўду сцвярджае
Упартасць хваль,
І продкаў запавет,
І мовы залатая сталь,
І нашых дум сусвет.
Тую праўду сцвярджае
Ўсё зноў і зноў
Ўсім лёсам,–
Няхай спакваля,–
У хмарах дубоў,
У вясёлках агнёў
Купальская наша зямля.
І няхай давядзе мне
Іншая кроў,
Што брашу,
Як сабачы сын,–
А няма нідзе
Вярнейшых сяброў
І прыгажэйшых жанчын.
Гэта край раскрытых душ і дзвярэй,
Гэты край –
Твой дом і сабор...
У нас дваццаць з лішнім тысяч рэк,
Адзінаццаць тысяч азёр.
Нам ёсць што піць,
З падмосткаў ліць,
Чым палі свае акрапіць,
А як давядзе, то ёсць нам дзе

І ворага ўтапіць.
І тая памяць не ў царкве,
А ў кожнай жыве галаве:
«На Беларусі Бог жыве...» –
І хай сабе жыве.
А калі ён шле на нас кару і гнеў,–
Ну што ж, – мы з ім свае:
У вяршыні самых гонкіх дрэў
Маланка з неба б'е.

У вяршыні маленькіх і ніцых дрэў
Маланка ніколі не б'е.

І пра тое кожны пяе салавей
Росным кветкам у роднай траве:
«На Беларусі Бог жыве»,–
І няхай да веку жыве.

У. Караткевіч, *Быў. Ёсць. Буду. Кніга паэзіі*, Мінск 1997, с. 11-12.

Уладзімір Караткевіч

**_Зямля пад белымі крыламі_**
(фрагменты)

*Зараз вясна. Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі[1] крылаў, плануюць[2] буслы. Іх многія і многія тысячы – хто лічыў? На вільчыках[3] сялянскіх хат, на дрэвах, на калонах старых разбураных палацаў, на слупах капліц сярод маладога зялёнага жыта. Гнёзды паўсюль.*

*І таму мне здаецца, што ў гэтыя – і не толькі ў гэтыя – дні зямлю нашу, Беларусь, можна назваць «зямлёю пад белымі крыламі». І не здзіўляйцеся [...] Да пэўнай ступені бусел – сімвал Беларусі...*

*Вось так і плануюць, плануюць буслы. Ветразі іхнія раскрылены над дрэвамі, пушысты хвост, як веерам[4], накрыў выцягнутыя ногі. А мне пад іхні палёт асабліва добра думаецца пра Беларусь, нашу з вамі радзіму.*

[...] Азёры – вочы зямлі. Воблік Беларусі нельга сабе ўявіць без азёр. Іх у нас каля 11 тыс. Вялікія і малыя, цёмныя, балотныя і светлыя, як самое святло. Лясныя, як Кромань або Свіцязь, і бязлесныя.

Азёры прыносяць не толькі матэрыяльную, але і духоўную карысць. Азёры не толькі кормяць навакольны люд, але і натхняюць паэтаў. Свіцязь натхняла Міцкевіча. Возера Няшчэрда – аднаго з першых беларускіх пісьменнікаў новага часу, аўтара «Рабункаў мужыкоў» і чатырохтомнага зборніка апавяданняў «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Яна Баршчэўскага. [...]

Тысячу год назад большую частку цэнтральнай і ўсходняй Еўропы пакрываў дзікі і цёмны першабытны лес. На многія і многія сотні кіламетраў шумелі лясныя волаты [...]

[1] **ветразь –** żagiel
[2] **планіраваць –** stopniowo i płynnie obniżać lot
[3] **вільчык –** górna krawędź dachu
[4] **веер –** wachlarz

...Тысячу год мерна гучала сякера, вёскі ўгрызаліся ў лес, палі наступалі на пушчы, і на трупах павержаных[1] і спаленых волатаў (такое поле называлася «лядо» або «ляда») хваляваўся ячмень.

Беларусь паступова бяднела звярамі. Зубр, які сустракаўся ў Палессі і на поўдні Прыдняпроўя яшчэ ў XVIII ст., быў выбіты і збярогся толькі ў Белавежы, быў знішчаны собаль, балотная рысь, або «лемпарт», чорны заяц, што сустракаўся ля Копыся яшчэ на пачатку XX ст., высакародны алень і многія іншыя. Знік у XVII стагоддзі дзікі бык-тур. [...]

І трэба многа, вельмі многа ездзіць, сябры. [...] Вы ўбачыце ўсе канцы нашай мілай, ласкавай няяркай краіны, якая, аднак, зачаруе вас сваёй няўлоўнай прыгажосцю. Убачыце Прыдняпроўе і Прынямонне, роўных якім па прыгожасці мала знойдзецца мясцін на зямлі. Убачыце далёкія агні новабудоўляў і цёмныя волаты замкаў, партызанскія зямлянкі і вясёлку Каложы. І азёры з белымі грабянцамі на сіняй вадзе, і старыя каменныя млыны над рэчкамі, што зараслі белай лілеяй, поўню ў азёрнай вадзе і водсвет яе на мокрых тратуарах гарадкоў. Будзеце слухаць музыку нашай пявучай мовы і нашы пяшчотныя песні. І ўбачыце зуброў і аленяў. Пройдзеце па зажураных пушчах Палесся. І, галоўнае, пазнаеце свой гасцінны, добры, горды і таленавіты народ.

Я не мог напісаць аб усім і ўсіх, і хай яны мне прабачаць.

І вы прабачце мне за доўгую размову. Калі пачнеш прызнавацца ў любові да самага дарагога – скончыць тое прызнанне амаль немагчыма.

Вы самі ўсё зведаеце больш за мяне, перад вамі куды больш доўгая дарога.

Любіце гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена, дый непатрэбна. [...]

У. Караткевіч, *Збор твораў у 8 тамах,* Мінск 1990, т. 8, с. 383, 425, 432, 569-570.

**Тэма 2:**

**На аснове інтэрпрэтацыі пададзеных фрагментаў п’есы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча пад загалоўкам *Пінская шляхта,* прадстаў паказаны вобраз засцянковай шляхты. Звярні ўвагу на яе станоўчыя і адмоўныя рысы, а таксама на спосаб іх прадстаўлення ў творы.**

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

***Пінская шляхта***
(фрагменты)

З’ява III

**Ціхон.** Хрэн табе ў вочы, – жонка, а жонка! Хадзі ды паўзірайся, як дачка твая з Грышкам Цюхайчыкам галубіцца!

**Куліна** *(за сцэнай)***.** Хто? Дачка? Бойся Бога, ды яна ж яшчэ малая. *(Уваходзіць).*

**Ціхон.** Які чорт малая! Хрэн табе ў вочы, – хадзі палюбуйся!

**Марыся.** Якая ж я малая, калі мне на Спаса скончыцца семнаццаць год?!

**Куліна.** Маўчы ты, хітрая лісіца! Бачыш ты, як яна скора палічыла гады!

**Ціхон.** Ах ты, чортаў сыну, – хрэн табе ў вочы! Не годзе, што бацька да жывога мяне пакрыўдзіў, назваўшы не шляхціцам, дык яшчэ сынок дачку баламуціць.

**Грышка.** Ды я ж яе люблю і хачу з ёю жаніцца...

**Ціхон.** Ось я цябе так пажаню, як твайго бацьку! Жонка, а жонка! Дай мятлу, – хрэн табе ў вочы!

**Грышка.** Што хочаце, тое рабіце, а ўсё-такі Марыся будзе мая! *(Да Марысі.)* Бывай здарова!

---

[1] **павержаны –** obalony, powalony

З'ява IV

Тыя ж і Куторга

**Куторга.** […] А я к вам з вялікаю навінаю. Не ведаеце? Толькі што пан асэсар[1] прыехаў, а такі сярдзіты, не дапускай Гаспод! Як ліхі татарын. Як толькі ўехаў у ваколіцу ды стаў каля Бэркі, дык зараз і закрычаў: дзесяцкіх[2], соцкіх[3]! Сабраць усю шляхту да Ціхона Пратасавіцкага, да каб Іван Цюхай-Ліпскі прыйшоў з сынам туды ж.

**Ціхон.** Хрэн яму ў вочы, – будзе бяда, будзе! Гэты сабака Ліпскі падаў на мяне ў суд, што я яго адлупцаваў, дык вот і асаэсара прыслалі. Ну, абдзярэ як ліпку!

**Куторга.** Вот дзіва, – на тое ён і асэсар! Заўваж толькі – у яго і рукі даўжэй, як у другіх людзей. [...]

**Ціхон.** Хрэн табе ў вочы! Добра табе прастарэкаваць[4], калі няма на шыі бяды. Ось скажы лепш, што рабіць? Пане Куторга, ты ж такі пісьменны чалавек, – можаш падаць разумную раду.

**Куторга.** А прымеце ж чэсна маіх сватоў да вашай Марысі?

**Куліна.** Бойся Бога, пане Куторга, – яна ж яшчэ маладзенькая! Гэта ж дзіця горкае.

**Ціхон.** Які чорт, дзіця, калі з хлопцамі цалуецца!

**Куторга.** Дык чаго ж чакаць! Гэта, кажуць, кепскі тавар: мый ды чашы, патом спяшы, – заплаці каму, каб вывез з дому.

**Ціхон.** Добра, пане Куторга, – бяры сабе дачку, і пасаг дам, толькі зрабі ласку: выцягні з бяды.[...]

**Куторга.** То ведаеце што, пане Пратасавіцкі? Як прыйдзе к вам асэсар, то стаўце мяне ў сведкі; хоць я і не бачыў, але буду сведчыць, што ён цябе біў, а ты толькі бараніўся. Не жаль для Марысі скрывіць душою. Толькі ж, пані Пратасавіцкая, прышліце сюды Марысю, каб я мог з ёю пагаварыць ды ўгаманіць дурную, бач, каб не цуралася разумнага чалавека.

**Куліна.** Памагайце толькі майму Ціхону, а ўжо Марыся будзе ваша; я ёй сама ладам напілую вушы... Пойдзем, Ціхон, прыгатуемся, каб па-гаспадарску прыняць найяснейшую карону. А ты, пане Куторга, пачакай, – зараз прышлю Марысю. *(Выходзіць з Ціхонам.)*

З'ява V

Куторга адзін.

**Куторга.** Ну, хвала Богу, бацькоў удалося атуманіць! Цяпер трэба пайсці ў галаву па розум, каб дзеўку амарочыць. Прынадны, бач, кусочак. [...] Праўда, век не схожы: я ўжо шосты дзесятак дажываю, а яна – семнаццаты гадок. Будзе клопату нямала, – о-ей. Не раз пачашу патыліцу, – моладзь, як пчолы ў вуллі, будуць аблягаць маю хату; прыяцеляў копамі лічыць буду. [...]

Падчас спеву ўваходзяць станавы[5] з Пісулькіным і хаваюцца па баках, каб падслухаць размову.

**Марыся** *(перабіваючы).* А ведаеце, ад чаго гэта, пане Куторга? – Ад старасці! Ды ты ўжо нямала пажыў, – пара аб дзяўчатах перастаць думаць, а Богу маліцца, каб даў спасенне. [...]

**Куторга.** Бач, сабака Грышка! Ён клешчам упіўся табе ў сэрца, ды нічога з таго не будзе. Бацька твой даклараваў мне тваю руку за тое, што я буду сведкам процiў Цюхая-Ліпскага. Найяснейшая карона прыехаў на прасоку[6] па жалабе Цюхая на твайго бацьку, што ён яго пабіў; і калі ты пойдзеш за мяне, дык я гатоў і душою пакрывіць, ды паказаць[7] на следстве, што бацька твой не біў Цюхая; а калі маё не ў лад, то я з сваім назад. Заспрачайся толькі, дык я зараз буду сведкам процiў твайго бацькі. Уехаў твой родны ў нерат – ні ўзад ні ўперад.

[1] **асэсар** – pracownik sądu, asesor
[2] **дзесяцкі** *(hist.)* – podsołtys
[3] **соцкі** *(hist.)* – w Rosji carskiej: osoba wybierana spośród chłopów do pomocy policji wiejskiej
[4] **прастарэкаваць** – opowiadać o błahostkach
[5] **станавы і станавы прыстаў** – naczelnik policji w przedrewolucyjnej Rosji
[6] **прыехаць на прасоку** – przybyć w celu rozpoznania sprawy
[7] **паказаць, (даваць паказанні)** – zeznawać (składać zeznania)

Папаўся б юрысту[1] ў кіпці, – выссе ён яго, як упыр[2] непамысную дзяўчыну. А калі б яму і ўдалося перапрасіць найяснейшую карону, то не канец яшчэ бядзе. […]

**Марыся.** Дарма ты мяне палохаеш! Мы з Грышкам паклонімся ў пояс найяснейшай кароне, дык ён пагодзіць нашых бацькоў, а табе за крывое паказанне дасць харошую гонку.

**Куторга.** Што?! Ты думаеш, што я баюся асэсара? Да я такой задам яму пары, што ён не згадае, дзе ўюны зімуюць. Я чалавек бывалы, маю розум і патраплю ладам яго вывесці ў поле, як зайчыка пад хартоў.

З'ява VII

Тыя самыя, Кручкоў і Пісулькін. Кручкоў падыходзіць ціха к Куторгу і б'е яго па плячы; Пісулькін жа з камічнаю ўхваткаю падыходзіць да Марысі, каторая сарамліва і баючыся кланяецца.

**Кручкоў.** Дык ты мяне думаеш вывесці ў поле? Хочаш навучыць, дзе ўюны зімуюць? Пачакай жа, галубчык! Я ж цябе навучу, куды няправых сведкаў садзяць! Гэй дзясяцкі!

**Куторга** *(зляканы).* Вашае благароднае сіяцельства! Найяснейшая карона! Да я ж толькі сабе жартаваў, – вот страшыў дурное дзяўчатка, каб яна прызволіла пайсці за мяне замуж. […]

З’ява VIII

**Кручкоў.** Ну, пане Пісулькін, пакінь ваша заляцанне, а бярыся за дзела. Тут, брат, нам харошае жніво!.. [...] А чы сабралася шляхта з ваколіцы?

**Дзесяцкі.** Усе сабраліся, хто з курыцаю, хто з кадобчыкам[3] мёду, а хто з сушонаю рыбай. Чакаюць, што ваша міласць ім прыкажа.

**Кручкоў.** Добра! Няхай ўсё аддадуць хурману, ды спакуйце там харашэнька ў возе... Ты пакліч сюды Ціхона Пратасавіцкага з кабетаю. А Цюхай-Ліпскі з сынам ёсць?

**Дзесяцкі.** Цюхай, апрача мёду і рыбы, прыцяг дзесяць вянкоў сушаных баравікоў, а сын яго – капу ражынкаў-уюноў.

**Кручкоў.** Добра, добра! Усё ўпакаваць асцярожна! Ды кліч усіх сюды!

*(Дзесяцкі выходзіць. Кручкоў строіць фурыозную фізіяномію[4]: адзін вус ставіць угору, другі ўніз. З глыбіні сцэны выходзіць шляхта, баіцца, кланяецца нізка хаваючыся адзін за другога. З бакавых дзвярэй выходзіць Ціхон Пратасавіцкі з жонкаю.*[…]

З’ява IX

Тыя самыя і Ціхон Пратасавіцкі, яго жонка, Цюхай-Ліпскі, яго сын Грышка, Цімох Альпенскі, Базыль Статкевіч і іншая шляхта.

**Ціхон.** Жонка, а жонка! Будзе бяда! Паглядзі, як у найяснейшай кароны вус адзін уніз, а другі ўгору задраўся. Ідзі ты наперад ды пакланіся яму, хрэн яму ў вочы.

**Куліна.** Што ты мяне пасылаеш? Ты сам наварыў піва, сам і папівай здароў, я баюся.

**Ціхон.** Ты – кабета, хрэн табе ў вочы, – ён жа цябе не з’есць! Вазьмі гэтыя грошы, – тут іх пяць дзесяткаў, – пакланіся ў ногі ды палажы на стол; ён жа юрыста, не адцураецца[5] ад грошай, – тагды і дзела пойдзе, як па салу.

**Куліна.** Ну, што рабіць, – папытаю. *(Яна боязна падыходзіць, кладзе грошы на стол, пасля кланяецца станавому нізка.)* Найяснейшая карона... […]

З’ява апошняя

Шляхта ап’янелая, хістаецца па сцэне без парадку; гутарка агульная без сэнсу; […] Кручкоў бярэ ўбок Альпенскага і кажа яму.

**Кручкоў.** Ведаеш, што на цябе казаў Статкевіч?

**Альпенскі.** А што?

---

[1] **юрыста** – prawnik
[2] **упыр** – wampir
[3] **кадобчык –** beczułka
[4] **фурыозная фізіяномія** – fizjonomia (twarz) furiata, groźna mina
[5] **адцурацца** *(ад чаго-небудзь)* – zrzec się, zostawić

**Кручкоў.** Ён казаў, што ты не шляхціц.
**Альпенскі.** Што? Ён мяне так зневажае? Вось я ж яму пакажу маё шляхецтва!
**Кручкоў.** Не пры мне, – як паеду, тады ты з ім расправішся! *(Адыходзіцца, бярэ ўбок Статкевіча.)* Знаеш? Цябе Альпенскі аблаяў мужыком.
**Статкевіч.** Ён смеў назваць мяне мужыком?! Мне сам Юры Кабылінскі падпісаў грамату, – дык я ж на шкуры яго выпішу сваё шляхецтва! *(Шугаецца да Альпенскага і пачынаюць біцца.)*
**Ліпскі.** Найяснейшая карона! Шляхта папілася і завялася біцца. Бойцеся Бога, раздыміце, а то і з вас штраф будзе належыць!
**Кручкоў.** Не ка мне, не ка мне, – няхай у суд падаюць, тагды прыеду на следства! Бывайце здаровы! *(Выходзіць з Пісулькіным.)* […]

В. Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*. [w:] В. Сянкевіч, Я. Грырарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ.* WSiP, Warszawa 2001, s. 59-67, 73.

## OCENIANIE ARKUSZA NA POZIOMIE PODSTAWOWYM
## Część I – rozumienie tekstu

| Nr | Odpowiedzi | Maks. liczba pkt. | Pkt. cząstk. | Uwagi |
|---|---|---|---|---|
| 1. | в) | 0 – 1 | | |
| 2. | «Вобразамі жыцця» называе Міхаіл Кацар увасобленыя ў арнаментах тканых і вышываных вырабаў: жыццёвыя выпрабаванні народных майстрых, іх адносіны да свету, з'яў прыроды, штодзённых заняткаў, а таксама адлюстраванне пачуццяў, пажаданняў, мар. | 0 – 2 | 1 | 1 – za ogólne stwierdzenie związku z życiem |
| 3. | «Жывапіс [...]абуджае *складаныя (далікатныя, эмацыянальныя)* душэўныя перажыванні». | 0 – 1 | | |
| 4. | Прасторавымі, аб'ёмнымі катэгорыямі аперыруе архітэктура і скульптура, а жывапіс і графіка карыстаюцца малюнкам, колерам, святлом. | 0 – 2 | 1 | 1 – za podanie jednego rodzaju sztuki |
| 5. | Кампазіцыя арнаментаў стрыманая, але высакародная. Прадстаўленыя на тканых і вышываных вырабах узоры, маюць сімвалічны сэнс і выяўляюць пэўную ідэю. Пакладзеныя ў арнаментыку вобразы, перадаюцца мінімумам выяўленчых сродкаў і ўвасабляюць адзінства формы і зместу. | 0 – 2 | 1 | 1 – za podanie jednego argumentu |
| 6. | Народныя майстрыхі ткалі ці вышывалі свае ўзоры не толькі дзеля самой красы. Прыгажосць спалучалі яны з практычнымі меркаваннямі. У арнаменце выражалі сваю просьбу, пачуцці, варажбу, пажаданні, падзяку і г.д. | 0 – 2 | 1 | 1 – za podanie jednej cechy ornamentu |
| 7. | Прадстаўляючы мастацкія і практычныя якасці народных вырабаў, М. Кацар ўжывае шматлікіх параўнанняў, пры дапамозе якіх перадае прыгажосць узору, а таксама абазначае іх сімвалічны, магчыма нават, магічны сэнс. Праравнанні ў такіх выказваннях поўняць вобразную, паэтычную функцыю. | 0 – 2 | 1 | 1 – za niepełną odpowiedź (np. tylko określenie środka językowego lub tylko podanie jego funkcji) |
| 8. | просьба-зварот, майсрыхі-сялянкі, селянін-хлебароб, багі-заступнікі, чалавек-працыўнік, селянін-гаспадар<br>Усе прыведзеныя прыклады складаюцца з двух назоўнікаў. Другі назоўнік у гэтых злучэннях удакладняе, пашырае значэнне першага. | 0 – 2 | 1 | 1 – za 2 przykłady z wyjaśnieniem lub za przykłady bez wyjaśnienia |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9. | Такое акрэсленне ўжыў аўтар, каб падкрэсліць своеасаблівасць арнаменту выражанага не слоўнымі вобразамі, якіх мэтай было выпрасіць у Бога (багоў) прыхільнасць і дапамогу ва ўсіх жыццёвых справах. | 0 – 2 | 1 | 1 – za stwierdzenie, że są to prośby, wyrażone nie werbalnie |
| 10. | Аздобленыя арнаментам рэчы выраблялася для асабістага і сямейнага ўжытку, а ніхто не жадае сабе нічога дрэннага. Вырабы з сімвалічным узорам служылі людзям для розных мэт, а іх арнаментыка мела прыхіліць ім шчасце, дапамагчы ў штодзённым змаганні з жыццём. Апрача таго людзі верылі, што Бог дапамагае толькі добрым і справядлівым. | 0 – 2 | 1 | 1 – za wskazanie jednego argumentu |
| 11. | б) | 0 – 1 | | |
| 12. | Адказ б)<br>Гэта своеасаблівы нарыс, які<br>– парывае з традыцыйнаю канвенцыяй навуковай працы,<br>– экспануе суб'ектыўны пункт бачання,<br>– падкрэслівае эмацыянальныя адносіны аўтара да прадмета,<br>– напісаны з вялікай свабодаю і дбаласцю пра прыгажосць маўлення, (параўнанні, вобразнасць, складаныя словы),<br>– у сваім вывадзе аўтар адклікаецца да гісторыі радзімы і народнага мастацтва. | 0 – 2 | 1 | 1 – za podanie tylko jednego argumentu wskazującego na źródło |
| 13. | інфармацыйная | 0 – 1 | | Uznaje się wskazanie na funkcję emocjonalną |

**Część II – pisanie tekstu własnego**
**Temat 1:**

**Porównaj obraz Ojczyzny przedstawiony w podanych utworach Uładzimira Karatkiewicza. Na podstawie wiersza *„Na Białorusi mieszka Bóg”* i fragmentów *Ziemai pod białymi skrzydłami* napisz, na czym polega miłość pisarza do Ojczyzny.**

| Kryteria | | | Punktacja 22 |
|---|---|---|---|
| **1. Rozwinięcie tematu** | 1. | Sformułowanie problemu przedstawionego w tekstach | 0 – 2 |
| | 2. | Wskazanie na gatunek literacki porównywanych tekstów. | 0 – 2 |
| | 3. | Wyjaśnienie symbolicznego znaczenia obu tytułów:<br>• *Na Białorusi mieszka Bóg* – sugestia uświęcenia pojęcia ojczyzny,<br>• *Ziemia pod białymi skrzydłami”* – metaforyczne; skazanie na przywiązanie do ziemi ojczystej (rzylot bocianów). | 0 – 2 |
| | 4. | Kreacja obrazu ojczyzny w wierszu i eseju:<br>• poetyzacja i sakralizacja pojęcia ojczyzny,<br>• powołanie się na świadectwo ludu, przyrody, istorii, tradycji i własnego doświadczenia,<br>• porównanie ojczyzny do świątyni<br>• przedstawienie dramatycznych dziejów narodu w ategoriach kary boskiej<br>• motyw Boga – stwórcy cudów tej ziemi. | 0 – 5 |
| | 5. | Wskazanie w obu utworach na wyniki działalności ludzkiej i rolę ludzi w losach kraju. | 0 – 2 |
| | 6. | Określenie sytuacji komunikacyjnej:<br>• podmiot liryczny – bliżej nieokreślony, ale wielki atriota, dumny z ojczyzny, jej wielowiekowej historii, języka oraz ludzi,<br>• może też reprezentować poglądy i odczucia poety,<br>• w eseju autor w subiektywny sposób opowiada o swoich wędrówkach po Białorusi,<br>• dzieląc się wrażeniami z podróży, autor odwołuje się do patriotycznych uczuć współobywateli i czytelników, próbuje zainteresować ich wiedzą o kraju, jego historii i kulturze, a przede wszystkim opisać piękno białoruskich krajobrazów,<br>• dentyfikacja podmiotu mówiącego z narodem („ja” – „my”). | 0 – 5 |
| | 7. | Wniosek pełny, np. dostrzeżenie przesłania utworów :<br>• wiara w swój naród, w jego mądrość i poświęcenie dla kraju,<br>• wskazanie na rolę i znaczenie dziedzictwa kulturowego i historycznego oraz wiedzy o kraju w patriotycznym wychowaniu społeczeństwa,<br>• spostrzeżenie, że siła narodu kształtuje się w trudnych momentach, a chwałę zdobywa się broniąc swojej ojczyzny i pracując dla niej. | 0 – 4<br>Wniosek pełny – 4;<br>niepełny –2;<br>krótkie podsumowanie – 1 |

| Kryteria oceny języka i kompozycji | | maks. 27 |
|---|---|---|
| **2.Składnia i fleksja** | Poprawna i nie schematyczna składnia i poprawna fleksja. | **9** |
| | Poprawna składnia i fleksja. | 7 |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja. | 5 |
| | Mimo błędów składnia i fleksja niezakłócająca komunikatywności języka. | 3 |
| **3. Słownictwo, frazeologia, styl** | Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl. | **10** |
| | Na ogół wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, Komunikatywny styl. | 7 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | 4 |
| **4. Ortografia, interpunkcja** | Na ogół bezbłędna ortografia. | **4** |
| | Sporadyczne błędy ortograficzne różnego stopnia. | 3 |
| | Błędy ortograficzne i interpunkcyjne z przewagą drugorzędnych. | 1 |
| **5. Kompozycja** | Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna. | **4** |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części. | 3 |
| | Wskazująca na próby porządkowania myśli, na ogół spójna. | 1 |

**Temat 2: Na podstawie interpretacji podanych fragmentów sztuki Wincentego Dunina-Marcinkiewicz pt. *Szlachta pińska* przedstaw obraz szlachty zaściankowej. Zwróć uwagę na jej dodatnie i ujemne cechy oraz sposób ich przedstawienia w utworze.**

| **Kryteria** | | | **Punktacja 22** |
|---|---|---|---|
| **1. Rozwinięcie tematu** | 1. | Zrozumienie problemu przedstawionego w tekście. | 0 – 2 |
| | 2. | Określenie gatunku i charakteru utworu. Wskazanie na humorystyczne i satyryczne ujęcie tematu. | 0 – 3 |
| | 3. | Określenie sytuacji, miejsca i czasu akcji:<br>• okolice Pińska, akcja toczy się w zaborze rosyjskim,<br>• po powstaniu styczniowym,<br>• przed i po rozpatrzeniu sprawy o pobicie na sesji wyjazdowej sądu. | 0 – 2 |
| | 4. | Bohaterowie sceny:<br>• bohater zbiorowy (prowincjonalna uboga szlachta pińska,<br>• wrażliwa na punkcie godności szlacheckiej),<br>• wskazanie na typowych przedstawicieli tego środowiska (Pratasawicki, Ciuchaj-Lipski),<br>• przedstawienie przyczyny ich bójki,<br>• portret Kutorhi – podstarzałego amanta, który za obietnicę małżeństwa i dobrego posagu zgadza się popełnić krzywoprzysięstwo,<br>• poruszenie kwestii konfliktu pokoleń (miłość Hryszki i Marysi – dzieci skłóconych rodzin),<br>• opis sposobu działania administracji carskiej (sędzia Kruczkou i sekretarz sądowy Pisulkin – sesja wyjazdowa jest dla nich okazją do wyciągnięcia od szlachty korzyści majątkowych). | 0 – 6 |
| | 5. | Sposób portretowania:<br>• wykorzystanie nazwisk znaczących,<br>• komizm postaci (np. niestosowność zalotów Kutorhi do Marysi; mina i ułożenie wąsów sędziego),<br>• komizm słowny (słownictwo i porzekadła Pratasawickiego oraz barwne wypowiedzi Kutorhi,<br>• ironia w opisie zachowania szlachty,<br>• wskazanie na podobieństwo cech przedstawicieli szlachty i chłopstwa (analfabetyzm, grubiaństwo, strachliwość w stosunku do administracji i in.). | 0 – 5 |
| | 6. | Wnioski:<br>**pełny wniosek** np. dostrzeżenie demaskatorsko-krytycznego charakteru sztuki, zwrócenie uwagi na niebezpieczeństwo manipulowania ciemną i zastraszona, ale dumną szlachtą, wskazanie na przedmiotowy stosunek urzędników carskich do mieszkańców zaboru, na podsycanie kłótni, | Pełny – 4<br><br>Niepełny – 2<br><br>Próba posumowania – 1 |

| Kryteria oceny języka i kompozycji | | maks. 27 |
|---|---|---|
| **2. Składnia i fleksja** | Poprawna i nie schematyczna składnia i poprawna fleksja. | **9** |
| | Poprawna składnia i fleksja. | 7 |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja. | 5 |
| | Mimo błędów składnia i fleksja niezakłócająca komunikatywności języka. | 3 |
| **3. Słownictwo, frazeologia, styl** | Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl. | **10** |
| | Na ogół wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, Komunikatywny styl. | 7 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | 4 |
| **4. Ortografia, interpunkcja** | Na ogół bezbłędna ortografia. | **4** |
| | Sporadyczne błędy ortograficzne różnego stopnia. | 3 |
| | Błędy ortograficzne z przewagą drugorzędnych i interpunkcyjne. | 1 |
| **5. Kompozycja** | Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna. | **4** |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części. | 3 |
| | Wskazująca na próby porządkowania myśli, na ogół spójna. | 1 |

**Miejsce na naklejkę z kodem szkoły**

*dysleksja*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

**Czas pracy 180 minut**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 12 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Wypełnij tę część karty odpowiedzi, którą koduje zdający. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
7. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Zamaluj ■ pola odpowiadające cyfrom numeru PESEL. Błędne zaznaczenie otocz kółkiem ◉ i zaznacz właściwe.

***Życzymy powodzenia!***

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **60 punktów**

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

**PESEL ZDAJĄCEGO**

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**KOD ZDAJĄCEGO**

## Część I – rozumienie czytanego tekstu

**Прачытай уважліва тэкст Андрэя Хадановіча і адкажы на пытанні. Пішы коратка, згодна з патрабаваннямі.**

Андрэй Хадановіч

***Уладзімір Караткевіч і філасофскі камень***

(скарочана)

1. Паспрабую вытлумачыць асацыяцыю Караткевіч–Толкіен. Гаворка пра стварэнне новых мастацкіх сусветаў. Жыццяздольных сусветаў, якія ў выніку робяцца нечым большым, чым проста літаратурнай фікцыяй, ушчэнт абвяргаючы[1] тэзу Арыстотэля пра мастацтва, якое ёсць толькі мімэзісам, толькі перайманнем прыроды.
2. Некалі Францішак Багушэвіч прыдумаў Беларусь, своечасова выдудзеў яе ў сваю магічную дудку. Выклікаў Беларусь да жыцця, адгадаўшы яе імя і назваўшы па імені. Намацаўшы[2] сутнасныя характарыстыкі беларускага героя. Такім гэты герой, відаць, быў – і такім застаўся ў нашым пісьменстве вось ужо на стагодздзе: панам сахі і касы; дурным, як варона; з крыўдаю на руках у крыві, на нагах у лапцёх… Нездарма дзеткі, дагэтуль вывучаючы ўсё гэта ў школе на памяць, ня хочуць быць такімі беларусамі і жыць у такой краіне.
3. Але існуе і суцэльна іншая Беларусь. Віртуальная краіна, якой, найхутчэй, ніколі і не існавала. Але гэта краіна, у якой хочацца пажыць, грамадзянства ў якой хочацца дамагчыся. Ідэальная Беларусь Уладзіміра Караткевіча, населеная шляхетнымі рыцарамі, сымпатычнымі прайдзісветамі3, выпівахамі і вылівахамі, мужнымі патрыётамі, нацыянальна свядомымі арыстакратамі з паэтычнымі здольнасцямі… Няма чаго дзівіцца, што ўжо чарговае пакаленне маладых беларусаў займае чаргу па візу ў гэтую краіну.
4. Краіну, якая стала радзімай такога ж віртуальнага народу, як, скажам, эльфы альбо, хутчэй, хобіты – ізноў паралель з Толкіенам абсалютна дарэчная[4]. Народу, што, як і хобіты, вынік з рамантычнай веры ў чалавека, з наіўнага і мудрага перакanання аўтара ў тым, што якім бы вялікім і трагічным ні выглядаў сусвет, якімі б малымі і бездапаможнымі ні выглядалі мы ў ім, аднак ад нас усё адно шмат чаго залежыць. Нават ад хобітаў. Нават ад беларусаў.
5. Ня варта здзіўляцца, што я параўноўваю рэальную нацыю з плёнам пісьменніцкай фантазіі, а пачынальніка жанру фэнтэзі – з, здавалася б, аўтарам гістарычных раманаў. Фантазіі маюць уласцівасць здзяйсняцца – нездарма ж, калі верыць показкам, вялікая колькасць «талкіенутых[5]» на пытанне пра нацыянальнасць адказвае «эльф». Што ж да беларускага фэнтэзі, то дыскусіі пра неабходнасць яго стварэння значна прыпазніліся. Беларускае фэнтэзі даўно існуе. Яго стваральнік – Уладзімір Караткевіч. З адным вельмі важным удакладненнем.
6. Сутнасная розніца паміж Караткевічам і яго ангельскім калегам ёсьць. Шчыры хрысціянін, Толкіен сціпла ўхіліўся ад спаборніцтва з Творцам на зямлі, прыдумаўшы паралельную тэрыторыю са сваімі мапамі і сваімі мовамі – туды цяпер масава ўцякаюць наваспечаныя «эльфы», аматары так званых ролевых гульняў[6]. Караткевіч жа дзёрзка і блюзнерча паставіў магічны экспэрымэнт проста ў краіне, якую меў пад рукой, – і экспэрымэнт аказаўся паспяховым. Зямля «пад белымі крыламі» караткевічаўскай магіі нарэшце зявілася на палітычнай мапе свету, а мова

[1] абвяргаць- obalać
[2] намацаць- (tu) demaskować
[3] прайдзісвет- chytrus, spryciarz
[4] дарэчны- sensowny
[5] «талкіенуты»- miłośnik Tolkiena
[6] ролевыя гульні- gry RPG

чым далей, тым болей пачала нагадваць фэнтэзійна-эльфійскую: сярод яе носьбітаў усё меней беларусаў Багушэвіча і ўсё болей гарадскіх інтэлектуалаў, якія на дзіва падобныя да герояў Караткевіча.

7. Я ведаў і ведаю [...] снобаў, якія цярпець не маглі і ня могуць тэкстаў Караткевіча, называючы іх то плягіятам, то безгустоўшчынай[7]. Напраўду, нескладана заўважыць, дзе наш аўтар «пакарыстаўся» творчасцю папярэднікаў. Скажам, верш «Калі паміраюць…» падазрона[8] нагадвае Веліміра Хлебнікава, колькі сцэнаў з «Каласоў…» занадта блізка перагукаюцца з талстоўскімі, Балотныя Яліны раз-пораз так і цягне назваць Баскервіль-Холам, а прагляд фільму Бэргмана «Сёмая пячатка» са знакамітаю шахматнай партыяй са Смерцю можа падпсаваць настрой не аднаму аматару «Ладздзі Роспачы». Але ўвесь фокус у тым, што ў швэдскага рэжысёра чалавек, як яму і належыць, прайграе, тады як у Караткевіча здараецца немагчымае, здараецца цуд, здараецца яўнае махлярства – і перамога. А пераможцаў, як вядома, ня судзяць – і чытачы ў захапленні. Так і з караткевічаўскім плягіятам.
8. Абвінавачанне ў безгустоўшчыне, на першы погляд, не такое і беспадстаўнае. Бо эпоха сур'ёзнай мітатворчасьці і выклікання да жыцця цэлых краінаў і нацыяў, здавалася б, мінула разам з В. Скотам і г. Сянкевічам. Таму і мастацкі арсэнал рамантыкаў і пазытывістаў XIX ст. выглядае крыху анахранічна. Лякалізаваўшы сваё «Міжзем'е» на тэрыторыі рэальнай Беларусі, Караткевіч апынуўся на самай мяжы літаратурнага кічу, на якой удала балянсуе, але часам і зрываецца: *«Гэта наляцела, як навала, і слабы чалавек ня вытрымаў. Усё зьлілося, закруцілася ў чырвоным кругавароце, і яна даравала мне нават боль…»* – такое ў XX ст. можа належаць адно масавай літаратуры, папяровым сэрыялам – альбо постмадэрнісцкай іроніі.
9. Чаму церпяць фіяска ўсе гэтыя экранізацыі, перайманні, наследаванні? У чым прычына таго, што немагчыма паўтарыць караткевічаўскага цуду ў ім самім зададзенай сыстэме мастацкіх каардынатаў? У самой сыстэме каардынатаў, якая парадаксальным чынам не пасуе нікому, апроч Караткевіча. Яшчэ раз нагадаю розніцу паміж ім і Толкіенам: легендарны Прафэсар, прыдумляючы свой свет, не канкураваў з Творцам на Ягонай тэрыторыі. Што да Караткевіча, звярніце ўвагу, з якой лёгкасцю ён парушае запаведзь і марна згадвае Божае імя. То павешаныя 1864 г. ім параўноўваюцца са сцягам волі, «якога й Богу нельга зняць», то ў яго «на Беларусі Бог жыве», то «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», то сам лірычны герой аказваецца літаральна ўкрыжаваным «за ўсіх двуногіх». Перад намі чыста рамантычны комплекс творцы-дэміюрга, які, да таго ж, не задаволены роляй «намесьніка» і «пасярэдніка», а проста займае месца Творцы – у створаным самім сабою свеце. Аднак жа жыццяздольнасць прыдуманага творцам сусвету наўпрост прапарцыйная яго любові да свайго твору. І тут ужо – альбо звышчалавечая мера любові, альбо ўся сістэма развальваецца, як картачны дамок.
10. Што і казаць, сітуацыя амаль безнадзейная, але хто ведае, можа, мы і атрымаем новую вэрсію міту пра Пігмаліёна, толькі ў якасці канчаткова ажылай Галятэі выступіць цэлая ідэалізаваная краіна, не кажучы ўжо пра яе мову і літаратуру. Прынамсі, літаратурная ноч, што заканамерна прыйшла на змену ўсім «прыцемкам» эўрапейскай культуры, яшчэ доўга не пагражае нам, запарукаю чаму апісаная тут шчасьлівая здольнасьць беларускага альхіміка ўсё, да чаго ён з любоўю дакранаўся, ператвараць у золата. У блакіт і золата дня.

Андрэй Хадановіч "***Уладзімір Караткевіч і філасофскі камень***", *[w:] ARCHE nr 1,2 (41,42)-2006,*
*[w:]* http://arche.home.by/2006-1/chadanovic106.htm

[7] безгустоўшчына- bezguście
[8] падазрона- podejrzanie

# Заданні

**Заданне 1** ***(1 пункт)***
Перад табою нарыс Андрэя Хадановіча. Назаві прынамсі дзве асноўныя жанравыя рысы, якія ў ім выступаюць:
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...

**Заданне 2** ***(1 пункт)***
Да якой антычнай эстэтычнай катэгорыі аўтар адклікуецца ў першым абзацы? Напішы, чым яна характарызуецца.
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...

**Заданне 3** ***(2 пункты)***
На якія асноўныя рысы беларускага героя ў традыцыйнай літаратуры звяртае ўвагу аўтар?
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...

**Заданне 4** ***(2 пункты)***
Да якіх літаратурных твораў ці зборнікаў навязвае аўтар у 2 абзацы? Хто з'яўляецца іх аўтарам?
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...

**Заданне 5** ***(1 пункт)***
На аснове 3 і 4 абзацаў напішы, чаму аўтар параўноўвае беларускі народ да эльфаў і хобітаў?
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...

**Заданне 6** ***(1 пункт)***
Растлумач выкарыстаныя пісьменнікам у 5 абзацы паняцці: фантазіі і фэнтэзі.
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...

**Заданне 7** ***(2 пункты)***
На якія розніцы між Караткевічам і Толкіенам звяртае ўвагу аўтар ў 6 абзацы?
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...
………………………………………………………………………………………………...

**Заданне 8** ***(1 пункт)***
У 7 абзацы аўтар піша: ”пераможцаў, як вядома, не судзяць- і чытачы ў захапленні”. Як гэтае выказванне адносіцца да дыскусіі пра плягіят у творчасці Караткевіча?
……………………………………………………………………………………………...
……………………………………………………………………………………………...
……………………………………………………………………………………………...

**Заданне 9** ***(1 пункт)***
Выпішы з 9 абзаца словы, якія абазначаюць:
- неверагодны, незвычайны………………………………………………………………
- няўдача ……………………………………………………………………………………..
- асоба, якая замянае каго-небудзь ……………………………………………………

**Заданне 10** ***(1 пункт)***
У чым заключаецца караткевічаўскі комплекс творцы- дэміюрга?
……………………………………………………………………………………………...
……………………………………………………………………………………………...
……………………………………………………………………………………………...

**Заданне 11** ***(1 пункт)***
На аснове ўсяго тэксту напішы, якая галоўная ідэя злучае творчасць Караткевіча і Толкіена?
……………………………………………………………………………………………...
……………………………………………………………………………………………...

**Заданне 12** ***(1 пункт)***
У 8 абзацы аўтар піша, што ”Караткевіч апынуўся на самай мяжы літаратурнага кічу”. Напішы, у чым заключаецца гэты караткевічаўскі кіч?
……………………………………………………………………………………………...
……………………………………………………………………………………………...
……………………………………………………………………………………………...

**Część II – pisanie własnego tekstu**

**Arkusz zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność pisania własnego tekstu związanego z tekstem literackim dołączonym do tematu. Wybierz jeden z tematów i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl.**

**Тэма 1: Прааналізуй і дай інтэрпрэтацыю верша Уладзіміра Жылкі *Беларусь.***

Уладзімір Жылка

***Беларусь***

Беларусь, Беларусь – гэты зык
Паліць душу маю, як агнём.
Я не ведаю, чым ён вялік,
Але думак не змог я аб'ём.
Як пачую яго, задрыжыць
Маё сэрца, заные ў грудзях,
І балюча так робіцца жыць,
І шукаеш чагосці ў людзях.

Беларусь, Беларусь... гэтых слоў
Пойме музыку, хто ўсёй душой
Іх магутны, тужлівы іх зоў
Зловіць думкай сваёю жывой, –
Затрапеча, бы ранены, ён,
Задрыжыць пад навалаю дум:
Гэткі страшна-пакутны іх стогн
І аб волі бязмерны іх сум.

Беларусь, Беларусь – гэта дзей
І разумных, і слаўных прыклад;
Край вялікіх і дум, і людзей,
І бяздольна схіліўшыхся хат,
Дзе нядоля і гора спрадвек
І беднота сярмяжных жывуць,
Крыўда дзе, паняверка і здзек
Краскай макавай ярка цвітуць.

Беларусь – край замчышч, курганоў,
Дзе таяцца страхоцці і звод,
Дзе русалкі выходзяць з віроў
І начніцы вядуць карагод,
Дзе пад шум каласоў ведзьмары
На палетках заломы кладуць
І ў купальскую ноч у бары
Забабоны ў пацёмках снуюць.

У. Жылка, *Беларусь*, [w:] В. Сянкевіч, Я. Грырарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ.* WSiP, Warszawa 2001, s. 175.

**Тэма 2: На аснове аналізу твора Максіма Багдановіча *Апокрыф* прадстаў погляды пісьменніка на ролю і значэнне мастацтва ў жыцці чалавека.**

Максім Багдановіч

***Апокрыф***

1. Ад Максіма Кніжніка пачатак...
2. І калі скончылася сем тысяч год ад стварэння свету, Хрыстос ізноў зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым сведчылі прарокі.
3. І хадзіў Ён па ўсім Забраным Краі і па Занёманшчыне, і па Задзвіншчыне, і па Бярэзінскай зямлі.
4. І разам з ім святы Пётра і святы Юр'я. Але ніхто з людзей не пазнаваў Яго.
5. Бо ішлі яны босымі нагамі з непакрытымі галовамі і былі адзетыя ў белы кужаль ды суконныя світкі, а не таго спадзяваліся людзі.
6. Таму ніхто не ўзяў увагі на іх, калі ў часе жніва праходзілі між працуючых людзей.
7. Толькі музыка, катораму цяпер не было чаго рабіць, падыйшоў да іх і сказаў: сорамна мне, бо сягоння дзень працы і ўсе клапоцяцца каля зямлі; адзін я нікчэмны чалавек.
8. І сказаў яму Хрыстос: не смуціся ў сэрцы сваім. Ці ж не твае песні спяваюць яны цяпер, у часе жніва! Таму не схіляй нізка галавы твае, і не хавай аблічча ад вачэй людскіх.
9. Бо няма праўды ў тым, каторы кажа, што ты – лішні на зямлі. Запраўды кажу я табе: надыйдзе яму гадзіна горычы – і чым ён разважыць тугу сваю, апроч песні твае? Як у дзень смутку, таксама ў дзень радасці ён прызавець цябе.
10. І навучаючы яго, казаў: пад песні кладуць чалавека ў калыску, і з спевамі ж апушчаюць у магілу яго.
11. Штодзённымі клопатамі поўніцца жыццё людское. Але калі зварухнецца душа чалавека, – толькі песня здолее спатоліць яе. Шануйце ж песні свае.
12. Бо спяваюць навет і жабы ў балоце, а ці ж не лепшымі будзеце вы за іх?
13. Так навучаў Хрыстос музыку. Але Пётра, пачуўшы словы яго, сказаў: Вучыцелю, у гэтай краіне ёсць людзі, каторым няма чаго есці. Ці ж не сціснецца ад сораму сэрца таго чалалавека, каторы, шукаючы скарынкі хлеба, прыйдзе з песняй да іх?
14. У адпаведнасці яму, сказаў Хрыстос: так, жыццё гэтых людзей цяжкое, беднае і прыгнечанае. Чаму ж ты хочаш яшчэ пазбавіць іх красы! Мала дадзена ім – няўжо ж трэба, каб было яшчэ менш?
15. І, абярнуўшы аблічча сваё да музыкі, папытаўся: калі пяюць песні ў вас?
16. Музыка адказаў: пяюць на Каляды, на Запускі, на Вялікдзень, на Тройцу, на Яна Купалу, у Пятроўку, на зажынках і дажынках.
17. Пяюць на радзінах і хрэсьбінах, пяюць дзіцё калыхаючы, і самі дзеці пяюць гуляючы; пяюць на ігрышчах і вяселлях, і на хаўтурах, і ў бяседзе, і пры працы, і на вайну ідучы, і ўва ўсякай іншай прыгодзе. Увесь круглы год пяюць.
18. І мовіў Хрыстос Пятру: ты, шкадуючы галодных людзей, асудзіў песню, але самі галодныя не асудзілі яе. Жывая яшчэ душа ў народзе гэтым.
19. Тады ізноў сказаў Пётра: але няхай жа ў песнях будзе страва для душы, няхай будуць думкі добрыя і навучаючыя, каб апроч красы, быў у іх і спажытак чалавеку.
20. І адказаў яму Хрыстос: няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы.
21. І навучаючы іх, мовіў: агляніцеся навокал! Ці ж не ніва калыхаецца каля нас?
22. Цяжка каля яе працаваў гаспадар і, вось бачыць: паміж збожжа ўзраслі васількі.
23. І сказаў ён у сэрцы сваім: хлеб адбіраюць у мяне гэтыя сінія кветкі, бо поўнаважкія каласы маглі б узрасці тут заміж васількоў.

24. Але, яшчэ з малацця краса іх прыйшлася мне да душы. І таму я не вырву з каранём іх і не выпялю, як усякае благое зелле. Няхай растуць і радуюць, як у маленстве, сэрца маё.
25. Так казаў сабе гаспадар у сэрцы сваім! І не падняў ён рукі на васількі.
26. Я ж кажу вам: добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?
27. І, кажучы так, пачуў Ён песню жнеек, і прамовіў: слухайце, што кажуць словы гэтай песні. Яе складалі людзі, якія ведаюць, чаго варты хлеб.
28. Яны ж пачулі, што словы тэй песні кажуць: няма лепш цвяточка над васілёчка. І далей ужо моўчкі ішлі яны.
29. І босыя ногі Хрыста пакідалі на цёплым, мяккім пылу дарогі сляды.
30. Але гора вам, людзі, бо даўно ўжо затапталі вы іх. Амін.

Рукапіс гэты адшукаў Максім Багдановіч

М. Багдановіч, *Апокрыф*. [w:] В. Сянкевіч, Я. Грырарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ*. WSiP, Warszawa 2001, s.124-126.

# OCENIANIE ARKUSZA NA POZIOMIE ROZSZERZONYM

## Część I – rozumienie tekstu

| Nr zad. | Odpowiedzi | Maks. Liczba pkt. | Pkt cząstk. | Uwagi |
|---|---|---|---|---|
| 1. | - суб'ектыўнасць выказвання<br>- дбаласць пра прыгажосць маўлення (нпр. наяўнасць паўтарэнняў і метафараў)<br>- твор пабудаваны паводле аўтарскіх асацыяцыяў а не класічных канонаў<br>- наяўнасць парадоксаў, паэтычных вобразаў ітп. | 0 – 1 | | |
| 2. | Аўтар адклікуецца да эстэтычнай катэгорыі мімэзіс, якая паводле Арыстотэля абазначала мастацтва, якое з'яўляецца перайманнем прыроды. | 0 – 1 | | |
| 3. | - сялянскае паходжанне<br>- прастата, дурацтва<br>- свядомасць уласнай крыўды<br>- бяда | 0 – 2 | 1 | 1- za podanie 2 cech |
| 4. | - ”Дурны мужык як варона” Францішак Багушэвіч<br>- ”Дудка беларуская” Францішак Багушэвіч<br>- ”Людзьмі звацца” Янка Купала | 0 – 2 | 1 | 1 pkt – za podanie 2 tytułów lub tytułów bez autora<br>2 pkt – za wskazanie 3 tytułów |
| 5. | - нацыянальная несвядомасць<br>- адсутнасць веры ў тое, што народ можа нешта змяніць | 0 – 1 | | |
| 6. | Фантазіі- уяўленні, мары; фэнтэзі- літаратурны жанр, які характарызуецца наяўнасцю фантастычных постаці і сусветаў. | 0 – 1 | | |
| 7. | - Прадстаўленыя Толкіенам у кнігах сусветы зусім выдуманыя, а свет Караткевіча- Беларусь,<br>- Толкіен- хрысціянін, Караткевіч- піша ў атэістычным духу | 0 – 2 | 1 | 1 – za wskazanie tylko jednej różnicy |
| 8. | Гэта доказ на тое, што Караткевіч- не плягіятар. Ён з'яўляецца майстрам прозы і ягонае майстэрства (”перамога”) сведчыць аб тым, што стварае ён арыгінальныя літаратурныя вобразы. | 0 – 1 | | |
| 9. | - парадаксальны<br>- фіяска<br>- намеснік | 0 – 1 | | |
| 10. | У сваіх творах Караткевіч з ”лёгкасцю парушае запаведзь і марна згадвае Божае імя”, як пісьменнік пераймае ў сваіх творах ролю Творцы | 0 – 1 | | |
| 11. | Ідэя стварэння новых, ідэальных сусветаў | 0 – 1 | | |
| 12. | На стварэнні фіктыўных светаў / нацыяў, лякалізаванні іх на тэрыторыі рэальнай Беларусі і на тварэнні на гэтым фоне новых мітаў. | 0 – 1 | | |

**Część II – pisanie tekstu własnego**

Temat 1:

**Dokonaj analizy i interpretacji wiersza Uładzimira Żyłki *Białoruś.***

| **1. Argumentacja tematu** | **L.p.** | **Kryteria oceny argumentacji tematu** | **Pkt 25 pkt.** |
|---|---|---|---|
| | 1. | Dostrzeżenie związku tematyki wiersza z życiorysem poety (Uładzimir Żyłka był poetą emigracyjnym, który spędził część swego krótkiego życia poza ojczyzną) | 0 – 1 |
| | 2. | Określenie typu liryki (bezpośrednia, patriotyczna). | 0 – 2 |
| | 3. | Określenie sytuacji komunikacyjnej:<br>• strofa pierwsza: podmiot liryczny podany w 1 osobie liczby pojedynczej (może być *alter ego* poety lub sam poeta),<br>• trofa druga: współprzeżywanie (wskazanie na osoby podobnie odbierające brzmienie słowa Białoruś),<br>• strofa trzecia i czwarta: wskazanie na uzasadnienie reakcji „ja” lirycznego. | 0 – 2 |
| | 4. | Określenie sytuacji lirycznej:<br>• liryka wyznania,<br>• monolog liryczny,<br>• próba określenia uczuć: ból, niepokój, duma, żal. | 0 – 2 |
| | 5. | określenie uczuć:<br>• ból,<br>• niepokój,<br>• duma,<br>• żal. | 0 – 2 |
| | 6. | Obraz Białorusi w oczach podmiotu lirycznego:<br>• gloryfikacja ojczyzny,<br>• sam dźwięk słowa „Białoruś” pali duszę podmiotu lirycznego jak ogień, przyprawia o ból w piersiach,<br>• słowo „Białoruś” wywołuje nostalgię i smutek, przywołuje wspomnienia,<br>• Białoruś to kraj, gdzie miały miejsce znaczące wydarzenia historyczne,<br>• na Białorusi nadal obecne są: niedola, ból, bieda jako „spadek” po sytuacji sprzed lat,<br>• jest to również kraj kurhanów, rusałek, zabobonów i wiary w czary. | 0 – 5 |
| | 7. | Dostrzeżenie kontrastów w przedstawionym opisie Białorusi | 0 – 1 |
| | 8. | Dostrzeżenie poetyckiej funkcji języka utworu:<br>• poetycka i rytmizacyjna funkcje powtórzeń, paralelizmów, anafor,<br>• rola epitetów i porównań,<br>• zastosowanie rymów oksytonicznych (męskich). | 0 – 3 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | 9. | Określenie nastroju wiersza: umiłowanie ojczyzny, któremu towarzyszy smutek, beznadziejność. | 0 – 1 |
| | 10. | Posługiwanie się pojęciami z teorii literatury. | 0 – 2 |
| | 11. | **Wniosek pełny, np.:** dostrzeżenie wielkiej roli Białorusi i wszystkiego, co z nią związane, dla podmiotu lirycznego: gloryfikacja ojczyzny i towarzyszący jej smutek oraz ból, wynikający z oddalenia, przebywania poza jej granicami | wniosek pełny – 4;<br><br>wniosek niepełny – 2;<br><br>próba podsumowania – 1. |
| **2. Język** | | **Kryteria oceny języka i kompozycji** | **20 pkt.** |
| a) składnia i fleksja | | | **6 pkt.** |
| | | Poprawna i nieschematyczna składnia i poprawna fleksja. | 6 |
| | | Na ogół poprawna składnia i fleksja. | 4 |
| | | Mimo błędów, składnia i fleksja niezakłócająca komunikatywności języka. | 2 |
| b) słownictwo, frazeologia, styl | | | **8 pkt.** |
| | | Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl. | 6 |
| | | Wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, komunikatywny styl. | 4 |
| | | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | 2 |
| c) ortografia, interpunkcja | | | **3 pkt.** |
| | | Na ogół bezbłędna ortografia, na ogół poprawna interpunkcja. | 3 |
| | | Błędy ortograficzne i interpunkcyjne.z przewagą drugorzędnych | 1 |
| **3. Kompozycja** | | | **3 pkt.** |
| | | Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna. | 3 |
| | | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części. | 2 |
| | | Wskazująca na próby porządkowania myśli, na ogół spójna. | 1 |

Temat 2:

**Na podstawie analizy utworu Maksima Bahdanowicza *Apokryf* przedstaw poglądy pisarza na rolę i znaczenie sztuki w życiu człowieka.**

| **1. Argumentacja tematu** | **L.p.** | **Kryteria oceny argumentacji tematu** | **Punktacja 25 pkt.** |
|---|---|---|---|
| | 1. | Zwrócenie uwagi na charakter utworu. | 0 – 1 |
| | 2. | Wyjaśnienie znaczenia tytułu. | 0 – 1 |
| | 3. | Określenie sytuacji komunikacyjnej:<br>● stylizacja na średniowieczną formę apokryfu (utwór o tematyce religijnej, w którym dosyć swobodnie przekazywano i interpretowano poszczególne opowieści biblijne),<br>● wskazanie na zamierzchłe czasy (7 000 lat od stworzenia świata),<br>● określenie miejsca i czasu akcji (ziemie białoruskie, lato, żniwa), | 0 – 2 |
| | 4. | Kreacja postaci:<br>● typizacja postaci (Chrystus wraz ze św. Piotrem i św. Jerzym wędrowali w przebraniu wieśniaczym – bose nogi, nienakryte głowy),<br>● przedstawienie postaci i poglądów pieśniarza (powtórzenie utartego stereotypu o próżniaczym życiu poety, twórcy),<br>● personifikacja jednej ze sztuk – muzyki (uważa siebie za nikczemnika, który nic nie robi, kiedy inni pracują)<br>● dostrzeżenie polemicznego charakteru wypowiedzi (pragmatyzm Piotra i estetyczna postawa Chrystusa),<br>● wskazanie na postawę wieśniaka (docenienie roli piękna). | 0 – 4 |
| | 5. | Umiejętność scharakteryzowania poglądów na temat sztuki:<br>● św. Piotra (ma wątpliwości co do znaczenia sztuki dla ludzi biednych i głodnych)<br>● Chrystusa (nie należy pozbawiać ludzi biednych kontaktu ze sztuką, ponieważ często jest to jedyne piękno w ich życiu) | 0 – 2 |
| | 6. | Dostrzeżenie oryginalności formy i języka wypowiedzi.<br>● forma apokryfu – umożliwia wprowadzenie postaci biblijnych oraz dowolną (apokryficzną) ich kreację,<br>● stylizacja na język średniowiecznych tekstów religijnych (tradycyjna forma pierwszych wersów oraz zdanie kończące utwór),<br>● liczbowe oznaczenie wersów (jak w księgach religijnych),<br>● symbole – pieśniarz, pieśni, bławatek symbolizujący sztukę, kłosy symbolizujące chleb<br>● funkcjonalność metafor. | 0 – 4 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | 7. | Określenie tematu utworu: refleksja o fizycznym i duchowym aspekcie życia i twórczości człowieka, o posłannictwie literatury (sztuki) i pieśniarza (twórcy), o potrzebie estetycznych wzruszeń (funkcja bławatka). | 0 – 2 |
| | 8. | Zwrócenie uwagi na estetyczne wartości sztuki obecnej w życiu każdego człowieka: np. piosenki śpiewane podczas pracy w polu, dziecku do snu, pieśni śpiewane w czasie świąt i uroczystości | 0 – 1 |
| | 9. | Posługiwanie się podstawową terminologią z zakresu poetyki (np. stylizacja, symbol, wers, epitet) | 0 – |
| | 10. | Umiejętność skonstruowania wniosku: (wniosek pełny) podkreślenie ogromnego znaczenia sztuki i jej duchowego aspektu w życiu każdego człowieka bez względu na jego urodzenie i majątek; obecność sztuki w najważniejszych momentach naszego życia; apokryf, jako forma umożliwiająca przekazanie prawdy o znaczeniu sztuki przez autorytet, jakim dla chrześcijan jest Chrystus | - wniosek pełny – 4:<br>- wniosek niepełny– 2:<br>- próba podsumowania – 1 |

| | | |
|---|---|---|
| **2. Język** | **Kryteria oceny języka i kompozycji** | **18 pkt.** |
| a) składnia i fleksja | | **6 pkt.** |
| | Poprawna i nieschematyczna składnia i poprawna fleksja. | 6 |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja. | 4 |
| | Mimo błędów, składnia i fleksja niezakłócająca komunikatywności języka. | 2 |
| b) słownictwo, frazeologia, styl | | **6 pkt.** |
| | Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl. | 6 |
| | Wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, komunikatywny styl. | 4 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | 2 |
| c) ortografia, interpunkcja | | **3 pkt.** |
| | Na ogół bezbłędna ortografia, na ogół poprawna interpunkcja. | 3 |
| | Błędy ortograficzne z przewagą drugorzędnych i interpunkcyjne. | 1 |
| **3. Kompozycja** | | **3 pkt.** |
| | Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna. | 3 |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części. | 2 |
| | Wskazująca na próby porządkowania myśli, na ogół spójna. | 1 |